ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 11 (3519) Панядзелак 13 студзеня 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781.

КОЎНЯ. Вярхоўны трыбунал зацьвердзіў сьмяротны прыгавар камуністам Кучынскаму і Кантаўскасу за хаваньне нелегальнай друкарні.

ХЭРСОН. У сяле Саланцы, Цурупінскага раёну, кулакі на сходзе сялян, дзе абгаворвалася пытаньне аб калектывізацыі накінуліся на жанчыну-бяднячку з дзіцём, якая выступала за калгас і хацела задушыць. Арыштавана 15 кулакоў.

У Магілеўскай акрузе Крычаўскі раён перайшоў на суцэльную калектывізацыю. Гэта 3-ці раён у акрузе, які ўжо калектывізаваны на 100 проц. 5.878 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгасы плошчаю ў 52.500 гэктараў зямлі.

РАСКУЛАЧВАНЬНЕ—АСНОЎНЫ СРОДАК ПОСЬПЕХУ СУЦЭЛЬНАЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Раскулачваньне ў раёнах суцэльнае калектывізацыі ператвараецца зараз у галоўную форму рэальнага практычнага наступленьня на капіталістычныя элемэнты вёскі, у асноўны сродак падаўленьня супраціўленьня кулака.

(«Правда» ад 11-1).

У сёпешнім нумары «Зьвязды» чытач знойдзе шмат паведамленьняў з месц аб росьце актыўпасьці кулака, аб яго шалёным супраціўленьні сацыялістычнаму калгаснаму будаўніцтву на сяле. Шпаркі тэмп калектывізацыі нашае вёскі, вялізарныя посьпехі ў галіне індустрыялізацыі, ператварэньне БССР з краю аграрна-адсталага ў індустрыяльна-калгасны ствараюць усім новую клясавую расстаноўку сіл, зусім новыя суадносіны клясаў.

У выніку росту сацыялістычных элемэнтаў, цэлага раду нашых мэрапрыемстваў, барацьбы супроць кулацтва, нам удалося навесьці сярэдняка на шляху сацыялістычнае перабудовы. Сярэдняк свой выбар зрабіў, ён пайшоў у калгас. Капіталістычны шлях разьвіцьця пакінуты ў баку. **Учарашні дробны вытворца у калгасе ўступае ў сфэру іншых вытворчых адносін, якія базуюцца на адмаўленьні прыватнай уласнасьці і на буйной калектыўнай вытворчасьці.**

Наступленьне на кулака, лінія на ліквідацыю кулацтва, як клясы, непарыўна зьвязаны з аграмаджаньнем дробнае і драбнейшае гаспадаркі. Рух сярэдняцкіх мас сялянства ў калгасы, сацыялістычная пераробка гэтых гаспадарак—адзначае пераробку тае глебы, якая нараджала капталістычныя элемэнты. Пэрыяд, які мы перажываем выяўляе яшчэ пячуванае да гэтага часу ўзмацненьне саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства і ўзмацненьне кіраўнічае ролі рабочае клясы ў гэтым саюзе. Суадносіны клясавых сіл у вёсцы характарызуюцца яшчэ тым, што сярэдняк у калгасе «становится в положение непримиримой борьбы против кулачества». («Правда»).

Як ужо было зазначана, мы маем масавае імкненьне бедняка і сярэдняка ў калгасы. Усе максымальныя плянавыя меркаваньні ў галіне калектывізацыі пакінуты далёка ззаду. Перад намі зараз канкрэтная задача, якая можа быць рэальна ажыцьцёўлена—калектывізаваць усе бядняцка-сярэдняцкія гаспадаркі БССР у працягу двух год. У нас растуць калгасы, складаныя па сваёй форме і буйныя па разьмерах.

Гэтыя вялізарныя зрухі, якія адбываюцца зараз у вёсцы, ня могуць ня ісьці побач з рэзкім абвастрэньнем клясавае барацьбы ў вёсцы. «Бо клясы, якія аджываюць, супраціўляюцца не таму, што яны сталі больш моцнымі, чым мы, а таму, што сацыялізм расьце хутчэй чым яны, і яны робяцца больш слабымі, чым мы» (Сталін). Бо ад палітыкі абмежаваньня кулацтва партыя перайшла да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Барацьба кулацтва супроць калгаснага будаўніцтва, зразумела, мацней за ўсё павінна адчувацца ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, дзе пытаньне аб ліквідацыі кулацтва, як клясы ўжо ажыцьцяўляецца. Гэтым і тлумачыцца, што ў нас, у БССР, найбольш шалёныя вылазкі кулакоў мы маем у Магілеўскай акрузе, дзе ўжо калектывізавана 55 проц. пасеўнае плошчы. Мы адсылаем чытача да надрукаванай у сёпешнім нумары карэспандэнцыі з Магілева. З яе чытач даведаецца аб зьбіваньнях, асобных выпадках забойства калгаснікаў, аб пагрозе кулакоў па адрасе беднякоў, якія ўступаюць у калгасы, аб адмаўленьні памолу хлеба калгаснікаў. «Ідзеце малоць у камунію»,—заяўляюць млынары калгаснікам.

Лісты сялькораў з іншых раёнаў, дзе ў апошні час узмацніўся калгасны рух, гавораць аб тым-жа. У Грэскім раёне, напрыклад, кулакі выразалі язык у каровы бедняка, які ўступіў у калгас.

Усе гэтыя выступленьні кулакоў спатыкуюць рэзкі адпор з боку саміх бядняцка-сярэдняцкіх мас. З месц паведамляюць, што беднякі і сярэднякі выносяць пастановы аб высяленьні кулакоў з тэрыторыі калгасаў. Мясцом трэба зразумець, што «суцэльная калектывізацыя ня можа з посьпехам разьвівацца без наступленьня на кулака ў форме раскулачваньня» («Правда»).

Кулакі ўжываюць ня толькі адкрытыя формы тэрору. Яны прабуюць узрываць калгасы знутры, пралазячы ў іх. Яны агітуюць за распродаж жывёлы калгаснікамі, яны псуюць каштоўную малочную жывёлу. У некаторых мясцох, пры патураньні мясцовых работнікаў, кулакамі арганізуюцца нават іллжэ-калгасы.

Мы павінны тут адзначыць, што катэгарычная забарона прымаць кулака ў калгас, ухваленая ЦК КП(б)Б, дзе-нідзе парушаецца. Заметкі, якія мы сёньня друкуем, паведамляюць аб асобных выпадках супраціўленьня мясцовых работнікаў выключэньню кулакоў з калгасаў. Нашы партыйныя арганізацыі павінны адкрыць агонь па такіх зьявах. Праяўленьні правага апартунізму на практыцы павінны быць выкрыты.

Беднякі і сярэднякі ў сваіх шматлікіх рашэньнях патрабуюць ад органаў пралетарскае дыктатуры, каб яны з усёй сілай абрушыліся на клясавых ворагаў, якія выступаюць супроць калгасаў, супроць калгаснікаў.

Аднак, мы павінны канстатаваць, што карныя органы вельмі часта недаацэньваюць палітычнага значэньня працэсаў над актыўнымі клясавымі ворагамі. У нашай прэсе ня раз паведамлялася аб мяккіх прысудах над забойцамі вясковых грамадзкіх працаўнікоў, калгаснікаў. Гэтыя прыгавары выклікалі справядлівае абурэньне бядняцка-сярэдняцкіх мас.

Выступленьням кулацтва супроць сацыялістычнага будаўніцтва трэба даць рэзкі і рашучы адпор. Трэба ўзмацніць барацьбу з клясавым ворагам, які адкрыта выступае супроць беднякоў і сярэднякоў, каторыя арганізуюць калектывы. Трэба прыняць меры да шпаркага і рашучага рэагаваньня на вылазкі клясавага ворага.

Усе факты, паданыя намі вышэй, паказваюць, з усёй відавочнасьцю, што клясавая барацьба ў вёсцы, у сувязі з працэсам суцэльнае калектывізацыі, асабліва абвастрылася. Суцэльная калектывізацыя нясе сьмерць кулацтву.

Галоўнай формай рэальнага наступленьня супроць капіталістычных элемэнтаў і асноўным сродкам падаўленьня супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў вёскі у раёнах суцэльнае калектывізацыі зьяўляецца раскулачваньне. («Правда»). Трэба практычна ажыцьцяўляць дырэктыву партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Успамянем яшчэ раз заяву тав. Сталіна па канфэрэнцыі аграрнікаў марксыстых:

«Зараз мы маем магчымасьць павесьці рашучае наступленьне па кулацтва, зламаць яго супраціўленьне, ліквідаваць яго, як клясу, і замяніць яго вытворчасьць вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў. Зараз раскулачваньне робіцца самімі бядняцка-сярэдняцкімі масамі, якія ажыцьцяўляюць суцэльную калектывізацыю. Зараз раскулачваньне ў раёнах суцэльнае калектывізацыі ня ёсьць ужо простая адміністрацыйная мера. Зараз раскулачваньне прадстаўляе там складаную частку стварэньня і разьвіцьця калгасаў. Вось чаму сьмешна і нясур'ёзна «распространяться» зараз аб раскулачваньні. Зьняўшы галаву, па валасох ня плачуць».

Зьезд калгаснікаў Клімаўшчыны

КЛІМАВІЧЫ, 12. Зьезд калгаснікаў Клімаўшчыны, які распачаўся 11 студзеня, разглядаў даклад аб выніках калектывізацыі і задачах весьнавое пасеўнае кампаніі.

На зьезьдзе высьветлілася, што ў Клімаўшчыне аб'яднана 10.000 гаспадарак на плошчы каля 120.000 гэктараў. Ворыва і сяўба зімавых аграмаджаны на 75 проц. і сродкі вытворчасьці—на 45 проц. Усюды праводзіцца ачыстка насеньня, рамонт машын і прылад. Адзначаецца распроданьне жывёлы і корму. Адчуваецца вялізарная нястача агранамаў і арганізатараў. Калгасы чакаюць рабочых.

У калгасах і навакол іх кіпіць клясавая барацьба.

Зьезд катэгарычна ставіць пытаньне аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, пазбаўленьня яго сродкаў вытворчасьці. Па-за калгасамі 600 кулацкіх двароў, іх землі перераданы калгасам.

Зьезд патрабуе хутчэйшага аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці і бязьпітаснае барацьбы з распрадаваньнем інвэнтару і кармоў.

Калгасы разгортваюць сацспаборніцтва — «Камунар Магілеўшчыны» выклікаў калгас «Ленінскі Шлях».

Бесьперапынку прыбываюць чырвоныя абозы з хлебам і ільном. Зьезд атрымаў у падарунак: пажарныя машыны, інвэнтар, аптэкі, плугі і кармушкі. Зьезд выліўся ва ўрачыстасьць па ўхваленьні генэральнае лініі партыі.

Зьезд пастанавіў хадайнічаць аб узнагародзе тав. СТАЛІНА другім ордэнам Чырвонага Сьцягу.

На працэсе фальшываманэтчыкаў

НЯМЕЦКІ ЎРАД--АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛЬНІК АНТЫСАВЕЦКАЙ ЗМОВЫ

Нямецкі генштаб распрацоўваў плян выступленьня супроць СССР

СЭНСАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ „РОТЭ ФАНЭ"

БЭРЛІН, 11. «Ротэ Фанэ» зьмясьціла сёньня сэнсацыйнае паведамленьне з асобных крыніц аб некаторых, да гэтага часу невядомых, надрабязнасьцях і закулісных бацох справы грузінскіх белагвардзейцаў і нямецкіх фашыстых.

Паведамляючы аб тым, што адбывалася 9-га студзеня на закрытым судовым пасяджэньні, «Ротэ Фанэ» зазначае, што грамадзкасьць была выдалена з залі суду паводле патрабаваньня абаронцы Карумідзэ, які заявіў, што павінен агаласіць «дакумант, які пагражае дзяржаўнай бясьпецы». Гэты дакумант зьяўляецца афіцыйным пасьведчаньнем, выданым Карумідзэ камандаваньнем 7-е групы рэйхсвэру і падпісаным генэралам Крэсам фон-Крэсанштэйнам, які толькі некалькі тыдняў таму назад зышоў з кіраўнічага паста у рэйхсвэры і зьяўляецца блізкім прыяцелем нямецкага вайсковага міністра Грэнэра і былога камандуючага нямецкай акупацыйнай арміяй на Каўказе. У часе палітваньня меншавікоў у Грузіі ён пазнаёміў Карумідзэ з генэралам Гофманам.

У Крэса адбываліся канфэрэнцыі, на якіх, акрамя Карумідзэ і інш. белагвардзейцаў, прымаў удзел і ангельскі генэрал Сток. Гэты генэрал камандаваў ангельскім войскам, якое ў 1919 годзе зьмяніла нямецкую акупацыйную армію ў Грузіі.

Паводле намаганьняў абвінавачанага Шмідта, былі паслены ў Мюнхэн вышэйшае чыноўнікаў нямецкага міністэрства замежных спраў для перагавораў з украінскімі эмігрантамі аб магчымасьцях антысавецкага выступленьня. Яшчэ ў жніўні 1927 году, ужо пасьля правалу фальшываманэтчыкаў, у Софію паехаў сын баварскага прэм'ера Гэльда для вельмі сурёзных перагавораў з Бэлем, які сядзіць цяпер на лаўцы падсудных. Бэль быў забясьпечаны нямецкім дыплёматычным пашпартам, хаця ён і не знаходзіўся на дыплёматычнай службе.

Выключна важную ролю ў фінансаваньні паездкі Гофмана ў Лёндан да Дэтэрдынга адыгрываў «Дрэзденскі банк», які перад вайною быў цесна зьвязан з Каўказам. Яшчэ два гады таму назад, у часе свайго побыту ў Нямеччыне, Дэтэрдынг меў спатканьне з кіраўнікамі гэтага банку.

Далей «Ротэ Фанэ» паведамляе, што генэрал Крэс даручыў афіцэру генэральнага штабу Адаму распрацоўку антысавецкіх ваенна - тактычных задач. Пры гэтым кансультантам зьявіўся Карумідзэ.

Нямецкія афіцэры, на чале з Крэсам, адхілілі ангельскі плян, і выступілі супроць Савецкага Саюзу з сваім пляном, маючы пляцдармам Пэрсію, і прапанавалі для гэтага выкарыстаць турэцкую правінцыю Лазістан па лініі Трапэзунд - Эрзэрум - Батум. Ва ўсім гэтым раёне мерквалася будаўніцтва чыгунак, аж-да савецкае мяжы, для ваенных апэрацый. Сюды, пад выглядам тэхнікаў, мелі паспаць вялізарную колькасьць нямецкіх афіцэраў. Баўгарскія парты Варна і Бургас, разьмешчаныя на Чорным моры, павінны былі служыць матар'яльнай базай.

Правал падробкі чырвонцаў перавярнуў увесь гэты плян. Мюнхэнская палітычная паліцыя свайчасова паведаміла аб правале Карумідзэ, Бэля і інш. і, такім чынам, уся шайка змагла часткова охавацца, часткова замесьці сьляды. Замешаныя ў гэту справу асобы атрымалі магчымасьць азнаёміцца з усімі дакумантамі сьледзтва, якія іменна ў Мюнхэне «рубіліся» на некалькі час з тым, каб іх можна было сфатаграфаваць.

Як паведамляюць, галоўная дзяржаўная пракуратура ўжо раілася па пытаньні аб магчымасьці прадаўлежэньня «Ротэ Фанэ» абвінавачаньня ў дзяржаўнай здрадзе за ўсе гэтыя выкрыцьці. Адначасова зазначаюць, што весткі аб закрытым пасяджэньні суду «Ротэ Фанэ» магла атрымаць толькі ад кагонебудзь з абвінавачаных. Гэтым укосна прызнаецца, што зькрыцьцё «Ротэ Фанэ» аднавялае сапраўднасьці. Нямецкае вайсковае міністэрства адхіляе апублікаваньня ў «Ротэ Фанэ» выкрыцьці ў частцы, якая датычыць рэйхсвэру. Пераважная большасьць нямецкіх газэт, включаючы і сацыял-дэмакратычныя, моўчкі абыходзіць выкрыцьці «Ротэ Фанэ».

Паводле апошніх вестак, пракуратура адмовілася ад узьняцьця супроць «Ротэ Фанэ» абвінавачаньня ў дзяржаўнай здрадзе, якое мерквалася спачатку. Аддзел друку міністэрства юстыцыі апублікаваў заяву, у якой зазначае, што супроць «Ротэ Фанэ» нельга ўзьняць справу, бо яна апублікавала ня зьмест агалошанага на закрытым пасяджэньні дакуманту, а толькі агульную справаздачу аб гэтым пасяджэньні.

ТВАР БЭРЛІНСКАГА ПРАЦЭСУ

Па СССР

311.740 тысяч руб. на электрабудаўніцтва ў 1929-30 г.

МАСКВА, 11. Савет Працы і Абароны зацьвердзіў плян электрабудаўніцтва на 1929-30 год. На працягу гэтага гаспадарчага году на раённых электрастанцыях СССР пушчана ў работу новая магутная сіла ў 475 тыс кілёват. СПА на электрабудаўніцтва ў 1929-30 годзе ўстанавіў суму ў 311.740.000 руб. Фінансаваньне пляну электрабудаўніцтва пабудавана на шырокім прыцягненьні 2-х спажыўцоў: прамысловых прадпрыемстваў і мясцовых саветаў.

Калектывізуем пчалярства

Пчалярства перабудоўваецца зараз з дробна-індывідуальнага ў буйна-калектыўнае. Бядняцкая і сярэдняцкія гаспадаркі абагульняюць свае пчальнікі і арганізуюць прамысловыя пчалярскія калгасы. Пчалярскія гаспадаркі ў саўгасах і калгасах дадуць гэтым летам каля 1.000 тон экспартнага мёду.

На мясцох арганізуецца 400 пасек на 60.000 вульлёў пчол і пашыраецца 114 існуючых пасек. Урад асыгнуе на гэту справу 1 мільён руб. і дадаткова 300.000 руб. на індустрыялізацыю пчалярства: васкабойныя і дрэваапрацоўчыя заводы, інвэнтарныя фабрыкі і вашчыныя майстэрні.

Наркамзем хадайнічае перад урадам аб тым, каб усе дзяржаўныя, каапэрацыйныя і калгасныя гадавальнікі пчол і матак былі аслабонены ад с.-г. падатку. У індывідуальных пчалярскіх гаспадарках, якія яшчэ застаюцца, вызначаецца закантрактаваць 150.000 раёў пчол, што можа даць яшчэ 1.500 тон мёду.

НОВЫ МЭТАЛЬ—ЛЯГЧЭЙ АД АЛЮМІНІЯ

ЛЕНІНГРАД, 9. Электратэхнічны інстытут, інстытут прыкладное хэміі і інстытут мэталю адкрылі шляхам сумеснае работы спосаб вытворчасьці мэталёвага магнія. Кіраўнік гэтых вопытаў прафэсар Антыпін паведаміў, што ўзоры мэталёвага магнія, атрыманыя ў Ленінградзкіх лябараторыях, у паўтара разы лягчэй ад алюмінія. Мэталёвы магній служыць для пабудовы важных часьцей машын, аж да аўтамабільных калёс. Зараз, калі вынайдзены спосабы прамысловае вытворчасьці магнія, ВСНГ прыступае да праектаваньня вопытнага заводу з штогоднай прадукцыйнасьцю ў 50 тон. Завод павінен быць скончаны ў гэтым годзе. Сырэц для вырабу мэталю —хлёрысты магній—знаходзіцца у балотах Сакскага возера ў Крыме ў такой вялізарнай колькасьці, што не паддаецца вучоту. Апрача таго, магній можна здабываць з карналіту, які залягае ў Салікамскіх месцанараджэньнях.

Захопніцкія пляны польскага фашызму

Курсы журналістых для прапаганды „Польшча ад мора да мора"

Фашысцкі ўрад зараз арганізаваў курсы журналістых па падрыхтоўцы да прапаганды захопніцкіх пляноў польскага імпэрыялізму ў адносінах да прыбальтыцкіх краёў.

Як паведамляе «Газэта Польска» (№ 8) названыя курсы гэтымі днямі пачалі сваю «працу».

Пры адкрыцьці курсаў прачытаў даклад пан Кватноўскі, міністар гандлю і прамысловасьці, на тэму — «Паварот Польшчы на Прыбальтыку». У сваім дакладзе ён фармулюе пляны польскага фашызму аб «Вялікай Польшчы», «Польшчы ад мора да мора». Усім вядома, што гэтыя пляны азначаюць захоп фашысткаю Польшчаю Савецкай Украіны і Савецкае Беларусі, а таксама ўсіх Прыбальтыцкіх краёў.

Вось сапраўдныя намеры польскага фашызму ў адносінах да суседніх народаў. Вось сапраўдная цана заяў польскіх фашыстых аб «брацкіх адносінах» паміж суседнімі народамі.

Прапаганда польскага фашызму за межамі

З мэтаю прапаганды польскіх імпэрыялістычных пляноў сярод палякаў, якія пражываюць за межамі, што зьяўляецца адным са сродкаў да падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу, фашысцкі ўрад арганізуе зараз «тыдзень эмігранта-паляка». У працягу гэтага тыдня будзе інтэнсыўна весьціся фашысцкая прапаганда сярод палякаў, якія пражываюць па-за межамі.

Як паведамляе «Газэта Польска» (№ 9), урадам выдзелены ўжо адпаведныя камітэты для правядзеньня гэтай новай фашысцкай кампаніі.

Польскія рабочыя і працоўныя ў Польшчы і ў іншых капіталістычных краёх выкрыюць сапраўдныя мэты гэтай новай фашысцкай кампаніі, таксама, як яны выкрывалі сутнасьць фашысцкай афэры гэтага-ж роду ў мінулым годзе, якая ішла пад фірмаю «зьезду зарубежных палякаў».

АХВЯРЫ ФАШЫСЦКАЕ ДЫКТАТУРЫ

Як паведамляе «Роботнік» № 7 за дзень 9-га студзеня зарэгістравана толькі ў аднэй Варшаве 6 самагубстваў рабочых. Гэтыя 6 рабочых зьяўляюцца ахвярамі беспрацоўя і голаду.

Новая сацыял-фашысцкая агентура на вёсцы

Сацыял-фашыстыя ППС ствараюць новую арганізацыю для правядзеньня фашысцкае працы сярод сялянскае беднаты пад ілжывай назвай — «Саюз малазямельных».

Усе спробы фашызацыі вёскі польскага фашызму ня ўдаюцца. Рэвалюцыйны рух асноўных мас сялянства Польшчы, З. Б. і З. У. усё ўзмацняецца і расьце. Арганізацыя новага фашысцкага саюзу на вёсцы на гэты раз пад шырмай ППС, зьяўляецца новай спробай затрыманьня рэвалюцыйнага руху асноўных мас сялянства. Гэтая новая фашысцкая спроба ня ўдасца таксама, як і ўсе іншыя.

РАБІНЫ І ЯЎРЭЙСКІЯ КЛЕРЫКАЛЫ-СЛУЖКІ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Як паведамляе «Кур'ер Віленскі» (№ 5), фашысцкія ўлады склікаюць зьезд яўрэйскіх рэлігійных абшчын (кагалаў).

Рабіны ў Польшчы, якія таксама, як папы, ксяндзы і інш. духавенства, зьяўляюцца вернымі служкамі і агентамі польскага фашызму, будуць абгаворваць пытаньне аб паленшаньні паслуг яўрэйска-клерыкальнай арганізацыі фашызму.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ СУПРОЦЬ ЯЎРЭЙСКІХ АГЕНТАЎ ФАШЫЗМУ

Як падае «Кур'ер Віленскі» (№ 8), 7 студзеня ў Варшаве адбылася камуністычная дэманстрацыя. Гэта дэманстрацыя была накіравана супроць сіяністаў —агентуры польскага фашызму і ангельскага імпэрыялізму, у сувязі з побытам сіяністкага правадыра Сокалава ў Варшаве. Дэманстрацыя была разагнана значнымі сіламі паліцыі.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ СЯРОД БЕСПРАЦОЎНЫХ

«Газэта Польска» ад 9-1 падае, што ў Белхатаве і Зэлеве (Лодзінскай акругі) адбыліся вялікія дэманстрацыі беспрацоўных з прычыны таго, што ўжо ў працягу доўтага часу ня выплачваецца мізэрная дапамога той частцы беспрацоўных (вельмі нязначнай), якая яе атрымлівала.

Голад на вёсцы ў Заходняй Беларусі

Фашысцкі нацыянал-і сацыял-фашысцкі друк усіх колераў і адценьняў упарта замоўчвае і ўтойвае сапраўднае становішча асноўных мас сялянства ў Заходняй Беларусі, голас працоўных мас ЗБ душыцца ўсім апаратам фашысцкай дзяржавы, усялякімі мерамі і сродкамі: дафэнзывай, турмамі, расстраламі, канфіскацыямі, забойствамі, нацыянал-фашысцкай работай і інш. і інш.

Некаторыя весткі аб гэтым становішчы прарываюцца паміж радкоў нават у фашысцкім друку, і перад намі адкрываецца жудасны малюнак нячувана катастрафічнага становішча асноўных мас беларускага сялянства ў ЗБ.

У мінулую зіму масы беларускага сялянства ў ЗБ перажывалі нячуванае няшчасьце голаду. Дзесяткі тысяч харчаваліся зельлем, карэньнямі, лупінамі, распрадавалі за бесцань рэшткі тэй мізэрнай «маемасьці», якія выпадкова ня былі забраны, за розныя шматлікія падатковыя павіннасьці фашысцкай дзяржавы. У дадатак да гэтага голаду—вынику рэжыму фашысцкай дыктатуры—вёску ЗБ пажыраў другі верны спадарожнік яго—розныя эпідэміі гыфусу і інш.

Новыя жудасныя весткі прарываюцца да нас. Яшчэ больш страшэнны голад пачынае пашырацца ў вёсцы ЗБ у гэтым годзе. Усю катастрафічнасьць гэтага становішча можна ўжо ацаніць па тых некалькіх скупых радкох у віленскай фашысцкай прэсе.

У фашысцкім «Кур'еры Віленскім» (№ 289) можна прачытаць наступнае:

«Зноў пагроза голаду ў Віленшчыне. Прадбачаньні, на жаль, зьдзяйсьняюцца, бо згодна справаздач павятовых улад пераважная колькасьці сялян у бліжэйшым часе пагражае голад».

У другім фашысцкім органе, у «Віленскім Слове» № 4 (орган польскіх аўтэрэўпамешчыкаў у ЗБ) мы знаходзім наступныя словы пад гэткім характэрным загалоўкам.

«Галгофа зямляроба.

Значная большасьць краёвай прэсы надта стороньня, калі не энтузіястычна прадстаўляла ў свой час нашай грамадзкасьці нібыта добрыя пэрспэктывы ўраджаю на гэты год у Польшчы, залічваючы сюды таксама і Віленшчыну. У абвяржэньне падобнай думкі ў адносінах да Віленшчыны толькі зараз роўнадушная і бесстаронная рэчаіснасьць найбольш выразна і дакладна адкідае так пасьпешна зрэдагаваную пацеху. Довадам гэтага ёсьць вестка аб тым, што «ўраджай» гэтага году не зьмякчыў некалькі гадовага падрад неўраджаю, а праз гэта ў бягучым годзе голад усё пашыраецца і пагражае вясковаму насельніцтву Віленшчыны, у прыватнасьці некалькіх паветаў».

Памешчыкі, кулакі прабуюць выкарыстаць гэтае становішча для яшчэ большага прыгнечаньня працоўных сялян. Яны прадракаюць скарачэньне ўсіх батракоў, каб аддаць замлю пад апрацоўку сялянскай беднаце. Гэта азначае ноны нязбыўчайны вырост памешчыцка-кулацкай эксплёатацыі працоўнага сялянства.

Голад, які ўжо некалькі гадоў пранягваецца ў акупаванай польскім імпэрыялізмам Заходняй Беларусі, не зьяўляецца выпадковым. Гэта вынік усёй палітыкі польскага фашызму наогул і на ЗБ у прыватнасьці. Ясным становішча для ўсіх працоўных мас ЗБ, што панаваньне буржуазіі і намешчыкаў гэта нагібель і выміраньне для працоўных мас Заходняй Беларусі. Праз фашысцкую дыктатуру галадаюць рабочыя, праз яе галадае асноўная сялянская маса ЗБ.

Гэтай працы ня ўдасца ўтаіць фашысцкім лёкаям з-пад сьцягу Луцкевіча і К°, гэтым заслужаным зброеносцам беларускай буржуазіі і кулакоў.

Камуністычная партыя Зах. Беларусі арганізуе працоўныя масы ЗБ на барацьбу супроць фашысцкага панаваньня —вінавайцы голаду, за зямлю бяз выкупу, за савецкую ўладу.

Працоўныя СССР і Савецкай Беларусі ўжо многа раз паказвалі сваю інтэрнацыянальную салідарнасьць, у прыватнасьці яны ўжо многа раз па меры сваіх магчымасьцяй дапамаглі працоўным ЗБ у іх цяжкой нядолі.

Працоўныя Савецкай Беларусі заўсёды з сваімі братамі з Заходняй Беларусі ў іх цяжкой барацьбе з фашысцкай дыктатурай.

ЯНЧУК.

5 млн. беспрацоўных у Амэрыцы

ГРЫН СКАЖАЕ ФАКТЫ

НЬЮ-ЁРК, 10. У Сан-Пітсбурзе адчынілася сэсія выканкому амэрыканскае фэдэрацыі працы. Старшыня фэдэрацыі Грын адзначыў у сваёй прамове, што ў сучасны момант у ПАЗША налічваецца 3 млн. беспрацоўных. Паводле слоў Грына, выканком абгаворвае пляны барацьбы з беспрацоўем. Грын прабаваў пры гэтым паменшыць значэньне сучаснага беспрацоўя і тлумачыць яго, галоўным чынам, розныя фактарамі сэзоннага характару, а таксама новымі дасягненьнямі тэхнікі.

Орган Амэрыканскае кампартыі «Дэйлі Уоркэр» рэзка крытыкуе заяву Грына і даводзіць, **што Грын перакручвае факты. Як падае «Дэйлі Уоркэр», у Амэрыцы зараз ня 3, а цэлыя 5 мільёнаў беспрацоўных.** (Трэба мець на ўвазе, што ў Амэрыцы ня існуе афіцыйнае статыстыкі беспрацоўя.).

ВАЛЮТНЫ КРЫЗІС У КІТАІ

Ні грошай, ні надзеі на пазыку

ПЭЙПІН, 10. «Пекін Лідэр» і «Пекін энд Цяньцзін Таймс» камэнтуюць зьяўжэньне курсу серабра ў Кітаі. «Пекін Лідэр» падкрэсьлівае наступныя асноўныя прычыны гэтага: 1) рост здабычы медзі і адначасны рост колькасьці здабытага пры гэтым серабра; 2) прыток серабра знутры краю ў шанхайскія банкі з прычыны грамадзянскай вайны, у выніку чаго Шанхай напоўнены серабром; 3) Кітай — адзіны край з сярэбрянаю валютаю. «Пекін Лідэр» зазначае, што камісія Кэмэрэра (амэрыканскі фінансавы дарадца) выказалася за пераход на залатую валюту, паводле прыкладу Індыі.

«Пекін энд Цяньцзін Гаймс» падкрэсьлівае, што в 1903 г. **курс серабра ня падаў так нізка, як зараз.** Па слова хранэты, у нармальны час Кітай быў бы самым буйным спажыўцом серабра. Цяпер-жа пры дэпрэсіі ў экспартным гандлі з прычыны грамадзянскае вайны, нерэгулярнага збору падаткаў, несвайчасовай нагрузкі тавараў і г. д. Кітай ня можа пагашыць сваю норму серабра. Пераходзячы далей да пытаньня аб залатым штандарце, газэта заяўляе, што пераход та залатую валюту патрабуе або наяўнасьці вялікіх грашовых запасаў, або атрыманьня замежнае пазыкі; і тое і другое ня можа быць ажыцьцёўлена ў сучасных умовах.

ШАНХАЙ, 10. У сувязі са зьніжэньнем цэн на серабро, кантынскі ўрад які атрымаў страту звыш 10 млн., абгаворваў мерапрыемствы, патрэбныя для задаваўленьня грашовага рынку. Ухваленыя палітычным саветам канкрэтныя пастановы па гэтым пытаньні не апублікоўваюцца.

Дзяржаўны дэфіцыт у Англіі расьце

ЛЁНДАН, 8. У канцы дзевяці месяцаў фінансавага году выявіўся значны дэфіцыт ангельскага дзяржаўнага бюджэту, які дасягае каля 170 мільёнаў ф. ст., супроць 138 мільёнаў у мінулым годзе. Хаця перавышэньне выдаткаў над прыбыткамі на працягу першых трох месяцаў, магчыма, скарацілца (у канцы году звычайна прыбыткі ўзрастаюць, выдаткі зьмяншаюцца), усё-ж, бясспрэчна, баланс будзе зьведаны са значным дэфіцытам.

Да гэтага часу з меркаваных 239.500.000 ф. ст. падатковых збораў казначэйства паступіла толькі 75 млн. ф. ст. Прыбыткі, атрыманыя ад марнаў збораў, зьменшыліся ў параўнаньні з мінулым годам на 3 мільёны ф. ст. Тое-ж адносіцца і да раду іншых катэгорый падаткаў. У той-жа час выдаткі ў параўнаньні з 1928 г. павялічыліся агулам на 15.500.000 ф. ст.

«Файнэншыэль Таймс», камэнтуючы становішча дзяржаўных фінансаў, піша: «Цяжка сабе ўявіць, якім чынам можна было-б унікнуць новага павышэньня падаткаў, а гэта зразумела ня можа садзейнічаць разьвіцьцю прамысловасьці і скарачэньню беспрацоўя». (ТАСС).

Забастовачны рух у Галяндыі

АМСТЭРДАМ, 9. Рост палявеньня пралетарыяту ў Галяндыі настолькі відавочны, што нават рэфармісцкі амстэрдамскі інтэрнацыянал вымушаны прызнаць, што ў 1928 г. у працоўных кафлікты ў Галяндыі было ўцягнута значна больш рабочых, чым у 1927 годзе. Паводле даных Амстэрдамскага інтэрнацыяналу, у 1928 г. лічба працоўных канфліктаў зьменшылася ў параўнаньні з 1927 і 1926 г., аднак, у той-жа час павялічылася лічба прадпрыемстваў, ахопленых працоўнымі канфліктамі, а таксама і лічба рабочых, якія прымалі ўдзел у забастоўках. Значна павялічылася та сама лік рабочых дзён, страчаных прычыны працоўных канфліктаў. Лік забастовак і лёкаўтаў у 1928 г. складае 295 супроць 216 у 1927 г. У 1928 г. забастоўках прымала ўдзел 15.200 рабочых супроць 12.000 у 1927 г. Лік прадпрыемстваў, ахопленых забастоўкамі складаў у 1928 г. — 1.297 супроць 7[illegible] у 1927 г. Лік рабочых дзён, страчаных з прычыны працоўных канфліктаў, складаў у 1928 г. — 664.500 супроць 193.[illegible] у 1927 годзе. (ТАСС).

СУПРОЦЬ БЕЛАГА ТЭРОРУ

Пралетарыят БССР узьнімае голас пратэсту

Супроць абнаглелае рэакцыі японскага імпэрыялізму

У сувязі з працэсам 825 у Японіі, рэдакцыяй штодня атрымліваецца ад фабрык, заводаў і ўстаноў г. Менску цэлы рад рэзалюцый-пратэстаў супроць зьверскіх учынкаў і зьдзекаў японскіх катаў-капіталістых над рабочымі.

Так рабочыя менскага хлебазаводу кляймяць ганьбаю японскіх імпэрыялістых і сацыял-здаходнікаў, якія падрыхтоўваюць крывавую расправу над лепшымі барацьбітамі рабочае клясы Японіі. У адказ на шалёны тэрор імпэрыялістых рабочыя абяцаюць узмацніць дапамогу палітзьняволеным у краёх капіталу і на ўсе 100 проц. уступіць у члены МОПР'у.

* * *

Агульны сход студэнтаў і настаўнікаў рабфаку з вялікім абурэньнем выносіць рэзкі пратэст супроць вылазкі абнаглелае рэакцыі японскага імпэрыялізму і ўхвалёў адлічыць на карысьць зьняволеных рэвалюцыянэраў 1 проц. свае стыпэндыі. Калектыў рабфаку заклікае ўсе студэнцкія арганізацыі пасьледаваць іх прыкладу.

* * *

Агульны сход сяброў МОПР'у **саюзу сельгаспасрабочых** адказвае ўзмацненьнем радоў

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная праверка радоў партыі

Узьнімаючы чыстку партыі на яшчэ большую палітычную вышыню, паскорым тэмпы праверачнай работы

Вывады праверкомаў поўнасьцю рэалізаваць у кожнай ячэйцы

ЗА ПОЎНУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ ВЫВАДАЎ ПРАВЕРКОМАЎ

Зараз ужо канчаецца праверка і чыстка арганізацый КП(б)Б. У сувязі з гэтым трэба завастрыць увагу ўсіх нізавых і акруговых партарганізацый наўкола задач поўнай практычнай рэалізацыі пастаноў і вывадаў праверачных камісій. Зусім відавочна, што праверачныя камісіі ў сваіх вывадах, зацьверджаных адпаведнымі партыйнымі органамі, даюць далейшы напрамак у рабоце партыйных ячэек, выяўляюць слабыя месцы гэтай работы і паказваюць, як трэба гэтыя недахопы і хібы ў практычнай рабоце выпраўляць у далейшым. Без поўнай рэалізацыі пастаноў праверкомаў мы ні ў якім разе не ажыцьцёвім поўнасьцю тых палітычных задач чысткі партыі, якія вызначаны ў пастановах XVі парткапфэрэнцыі і ЦКК УсеКП(б)). Бо генэральная праверка і чыстка партыі мае на мэце ня толькі ачысьціць партыю ад ідэёва-і сацыяльна-варожых элемэнтаў, ад тых, хто ня можа быць актыўным удзельнікам сацыялістычнага наступленьня, задачай чысткі зьяўляецца таксама максымальна ўзмацніць якасьць работы партыйных ячэек на ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага наступленьня. Аб гэтым заварстрае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый цэнтральны орган нашай партыі—«Правда». У артыкуле **«Рэалізаваць поўнасьцю» «Правда»** піша:

«Чыстка партыі амаль жо скончана Аднак, гэта зусім ня значыць, што лёзунг аб чысткі партыі ўжо рэалізаваны поўнасьцю. Генэральная чыстка побач з вызваленьнем радоў УсеКП(б) ад усяго некамуністычнага і нягоднага элемэнту, зьяўляецца сапраўдным масавым агледам усёй партыйнай работы: чыстка правярае кожную адзінку нашай партыі і ўскрывае слабыя «вузкія» месцы ў яе стане і штодзённай рабоце. Побач з гэтым чыстка зьяўляецца вагаром далейшага разьвіцьця і ўзмацненьня кожнай партыйнай арганізацыі, кожнай партыйнай ячэйкі: чыстка павінна яшчэ больш узмацніць сувязь парт'ячэек з масамі, яшчэ больш павысіць ленінскую баяздольнасьць і непрымірымасьць ячэек да антыбальшавіцкіх ухілаў, яшчэ больш згуртаваць рады камуністых на аснове генэральнай лініі сацыялістычнага будаўніцтва».

Ясна, што партыйныя арганізацыі і ячэйкі змогуць ажыцьцёвіць гэтыя баявыя палітычныя задачы партыі толькі ў тым выпадку, калі яны поўнасьцю выканаюць прапановы, пастановы і вывады праверачных камісій, гэ:

«Пастановы праверачных камісій, зацьверджаныя мясцовымі кіраўнічымі партыйнымі органамі, служаць дырэктывай, якою трэба кіравацца ў далейшай рабоце».

Між тым, факты, якія выяўляюцца па пленуме **Фрунзаўскага РК КП(б)Б**, сыгналізуюць аб тым, што асобныя парт'ячэйкі не зрабілі вывады праверкомаў асноўным цэнтрам сваёй далейшай работы. Гэтыя ячэйкі ня толькі не ажыцьцяўляюць пастаноў камісій па чысткі, а нават не перабудавалі форм і мэтадаў сваёй работы ў сувязі з тым зрухам, які ўнесла праверка і чыстка. Трэба ўсямерна падтрымаць прапанову ЦО партыі «Правды» аб тым, каб стварацъ брыгады па праверцы ажыцьцяўленьня партыйнымі ячэйкамі дырэктыў праверачных камісій. Да практычнага правядзеньня гэтай работы трэба прыступіць безадкладна. Трэба дасканала выявіць, паколькі ячэйкі практычна замацавалі вынікі чысткі і па практыцы ажыцьцяўляюць усе тыя дырэктывы і прапановы, якія вызначаны ў пастановах праверачных камісій.

Пленум Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Аб ходзе чысткі вытворчых ячэек

З дакладу т. Жуковіча

Пленум Фрунзаўскага РК КП(б)Б, які адкрыўся гэтымі днямі, заслухаў даклад тав. Жуковіча аб ходзе чысткі вытворчых парт'ячэек.

Тав. Жуковіч адзначыў, што ўжо праверана 15 проц. буйных вытворчых ячэек КП(б)Б. На практыцы гэтых ячэек трэба выправіць у працэсе далейшай чысткі тыя недахопы і хібы, якія зараз маюць месца. Але, перш за ўсё, трэба адзначыць, што ў асноўным чыстка праходзіць у поўнай адпаведнасьці з задачамі і прынцыпамі, вызначанымі па інструкцыі ЦКК УсеКП(б). Адзначаючы хібы, мы маем на мэце іх безадкладна выправіць, каб поўнасьцю забясьпечыць выразнае ажыцьцяўленьне палітычных задач чысткі партыі.

Галоўным недахопам трэба лічыць слабую падрыхтоўчую работу да чысткі. З прычыны слабое падрыхтоўкі па некаторых ячэйках, беспартыйныя рабочыя і работніцы амаль зусім ня прымаюць удзелу ў праверцы. Напрыклад, на чыгунцы, у ячэйцы вагонных майстэрань прышлося з тэтай прычыны некалькі раз адкладваць праверачныя сходы. На сходзе па чысткі гэтай ячэйкі нават ня было многіх камуністых. Па ячэйцы Белдзяржбуду з 5.000 рабочых-будаўнікоў у чысткі прымала ўдзел толькі 50-60 чалавек. Побач з тэтым трэба адзначыць слабы ўдзел камсамолу ў праверцы ячэек.

Аб слабасьці падрыхтоўчай работы гаворыць і той факт, што асобныя партыйны незразумелі асноўных задач чысткі. Гэтыя партыйцы капаліся ў дробязных справах, ня імкнучыся выявіць палітычна - клясавага твару данага камуністага. Члены ячэйкі Аўтакіраўніцтва прабавалі замазаць тыя недахопы, якія маюць месца ў ячэйцы. Ва ўстанове былі выкрыты моманты безгаспадарчасьці. Аднак, партыйцы на сходзе па чысткі не крытыкавалі і не выяўлялі канкрэтных носьбітаў зла. На чыгунцы камуністыя выказваліся ў спрэчках на праверачных сходах аб дробязных нясур'ёзных праступках таго ці іншага партыйца. Але амаль ніхто не выкрываў тых камуністых, якія плятуцца ў хвасьце, адмаўляюцца ад падпіскі на пазыкі індустрыялізацыі і г. д.

У часе чысткі трацкісцкія элемэнты імкнуліся сарваць і апаганіць праверку. Такі факт меў месца ў ячэйцы абутковай фабрыкі. Трэба адзначыць, што ня ўсе партыйцы далі адпор выступленьню трацкістага. Частка партыйцаў не хацела выкрываць дзейнасьці гэтага трацкістага, а некаторыя нават імкнуліся яе апраўдаць.

Яшчэ рад фактаў сьведчыць аб тым, што асобныя ячэйкі не вялі рашучай барацьбы з трацкістымі, дробна-буржуазнымі і нацыянал - дэмакратычнымі настроямі на прадпрыемствах, не давалі своячасовага адпору шавінізмам усіх колераў. Чыстка паказала, што дробна-буржуазныя настроі распаўсюджваюцца тымі партыйцамі, якія прышлі ў партыю, захаваўшы сваё сацыяльнае паходжэньне (дэзэртыры, былыя гандляры і г. д.). На лямцавай фабрыцы ў партыю быў прыняты самагончык. Гэта гаворыць аб тым, што некаторыя ячэйкі няўважліва адносяцца да прыёму новых членаў.

Нарэшце, тав. Жуковіч спыніўся на патрэбнасьці своячасова змагацца з дэмабілізацыйнымі настроямі ў тых некаторых ячэйках, дзе ўжо скончана чыстка. Ёсьць рад фактаў, калі ячэйкі не ажыцьцяўляюць на практыцы вывадаў камісіі. У бліжэйшы час трэба будзе зрабіць праверку практычнага ажыцьцяўленьня ячэйкамі прапаноў і вывадаў камісіі па чысткі.

У заключэньне тав. Жуковіч падкрэсьліў, што папярэднія вынікі праверкі і чысткі вытворчых ячэек выразна гавораць аб тым, што вытворчыя ячэйкі ў асноўным зьяўляюцца самімі здаровымі і баяздольнымі кадрамі партыі. Аб гэтым можна меркаваць па наступных лічбах. Па вясковых ячэйках выключана з партыі 15 проц., па савецкіх — 12-13; па вытворчых — 3-5 проц.

У прэзыдыуме ЦКК КП(б)Б

Паскорыць тэмп чысткі

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б на сваім пасяджэньні 11-га студзеня 1929 г падагуліў папярэднія вынікі чысткі партыйных арганізацый КП(б)Б. Былі заслуханы інфармацыі старшыні Віцебскай АКК т. **Мундаў** і старшынь некаторых камісій па чысткі вытворчых парт'ячэек **Менскай** арганізацыі.

Праверка і чыстка арганізацый КП(б)Б падыходзіць да канца. Савецкія і вузаўскія парт'ячэйкі ў сваёй асноўнай масе ўжо праверены. Зараз шырока разгорнута праверка і чыстка вытворчых арганізацый.

Па **Віцебску** чыстка савецкіх і вузаўскіх ячэек выявіла шмат хваравітых зьяў і буйных хібаў у практычнай рабоце частак ячэек. Агульны лік выключаных з савецкіх і вузаўскіх ячэек хістаецца ад 9 да 10 проц. Па сацыяльным паходжэньні выключаныя падзяляюцца наступным чынам: рабочых — 19 проц., сялян — 23 проц. і служачых —58 проц 27,2 проц. членаў і кандыдатаў партыі ў савецка-вузаўскіх ячэйках атрымалі партыйныя спагнальні. У радзе ўстаноў у працэсе чысткі былі выкрыты скажэньні клясавай лініі, факты бюракратызму і г. д., на якія даныя ячэйкі не рэагавалі. Многія раённыя камітэты з свайго боку слабавата кіравалі работай савецкіх ячэек. Актыўнасьць пры чысткі савецка-вузаўскіх ячэек у асноўным была здавальняючая. Практыка вылучэньня рабочых брыгад палкам сябе апраўдала. Прымацаваныя вытворчыя ячэйкі прынялі актыўны ўдзел у праверцы і чысткі савецка-вузаўскіх ячэек.

Нармальнаму ходу праверкі перашкаджала тое, што ў практыцы чысткі прыходзілася зьмяняць склад праверкомаў. Быў выпадак, калі АКК прымушана была адклікаць ўдаго старшыню праверкому за грубасьць

Чыстка вытворчых ячэек Віцебскай арганізацыі праходзіць пад знакам масавай праверкі ўсёй партыйна-палітычнай і гаспадарчай работы ячэек. Можна з упэўнасьцю сказаць, што чыстка вытворчых ячэек яшчэ больш узьніме клясавую і палітычную баяздольнасьць пралетарскіх кадраў Віцебскай арганізацыі.

Паводле інфармацыі асобных старшынь праверкомаў па чысткі вытворчых ячэек Менскай арганізацыі КП(б)Б выявілася, што ня ўсе ячэйкі здавальняюча правялі падрыхтоўчую работу. Так, у ячэйцы ДЭПО МБВ чыгункі на першым праверачным сходзе прысутнічала менш 50 проц. камуністых. Удзел беспартыйных рабочых у праверцы і чысткі зусім невыстарчальны. Такое-ж становішча мае месца і ў ячэйцы вагонных майстэрань.

Трэба своячасова завастрыць увагу партыйных арганізацый на недапушчальнасьці кругавой парукі ў часе чысткі. Бо такія моманты, як паведамілі старшыні праверкомаў прэзыдыуму ЦКК, у практыцы асобных ячэек маюць месца. У ячэйцы ДЭПО камуністыя, добра ведаючы, што даны партыец у мінулым займаўся кантрабандай, чамусьці маўчаць і не паведамляюць аб гэтым праверкому.

Прэзыдыум ЦКК завастрыў увагу праверкомаў на патрэбнасьці рашуча ўзмацніць тэмпы чысткі, не дапускаючы пагоршаньня якаснага боку праверкі. Ёсьць выпадкі, калі праверкомы марудзяць з пэрсанальнай праверкай камуністых, прапускаючы за адзін вечар толькі 2—3 чалавек. Пры гэтым дапускаецца капаньне ў дробязных справах, падрабязнае і дасканалае заслухоўваньне біяграфіі і г. д. Побач з гэтым прэзыдыум зьвярнуў увагу праверкомаў на патрэбнасьць больш уважліва і выразна складаць афіцыйныя пратаколы і пастановы па вывадах чысткі. Адзначаны рад выпадкаў, калі прэзыдыумам АКК прыходзілася ў корані перарабляць пратаколы і пастановы некаторых праверкомаў.

Р—н.

15-га студзеня, а 5-й гадз. увеч. у памяшканьні чырвонага кутка (вул. Розы Люксэмбург, № 26)

пачынаецца праверка членаў і кандыдатаў ячэйкі КП(б)Б Менскай шчотачнай ф-кі.

Што паказала праверка парт'ячэйкі ЦВК БССР

Чыстка з усёй сілай выкрывае тых камуністых, якія няздольны быць актыўнымі ўдзельнікамі нашай барацьбы, якія адарваліся ад партыйнага жыцьця і паступова страцілі свой партыйны твар. Праверка ячэйкі КП(б)Б ЦВК БССР паказала, што ў ячэйцы ёсьць камуністыя гэтага тыпу.

У мінулым (1925—27 г г.) група камуністых дапускала ў ячэйцы абураючыя агіднасьці, якія заключаліся ў калектыўным п'янстве, распусьце і г. д. Другая-ж група партыйцаў, у тым ліку і адказных, ведаючы пра тыя агідныя справы, якія тварыліся ў ячэйцы, ня ўжыла ніякіх мер да іх рашучага зьнішчэньня. У ячэйцы ў той час расквітнела кругавая сямейнасьць, пры дапамозе якое частка партыйцаў пакрывала свае непартыйныя ўчынкі.

З прычыны невыстарчальнага кіраўніцтва і перэагаваньня з боку бюро, частка камуністых адарвалася ад жыцьця ячэйкі, не адчувала на сабе партыйнага ўплыву і паступова ўсё больш і больш траціла свой партыйны твар. Гэтыя партыйцы ня выконвалі ніякіх абавязкаў у ячэйцы. Тыя-ж камуністыя, якія мелі нагрузку, безадказна адносіліся да даручанай ім работы, бо бюро зусім не сачыла за выкананьнем сваіх даручэньняў. Лёзунг самакрытыкі не атрымаў у ячэйцы ніякага адлюстраваньня. Нават у часе чысткі асобныя члены ячэйкі імкнуліся перашкодзіць некаторым таварышом выступіць з крытыкай недахопаў.

Існавала думка, што самакрытыка зьменшыць аўтарытэт такой установы, як ЦВК, а таму лепш... маўчаць і штэмпэляваць. Пасьля такой «установкі» праверком прымушаны быў супольна з раённым камітэтам партыі на закрытым партсходзе даць рэзкі адпор тым, хто імкнуўся апаганіць лёзунг партыі аб самакрытыцы.

Ухваляючы партыйныя пастановы, ячэйка ня здолела ажыцьцёвіць іх на практыцы. Ячэйка не змагалася з недахопамі і перашкодамі ў практыцы асобных аддзелаў установы. У рабоце падрыхтоўчай камісіі СНК БССР па пытаньні муніцыпалізацыі і дэмуніцыпалізацыі дамоў дапушчаны рад сур'ёзных памылак і скажэньняў клясавай лініі. У справах выбарчай камісіі ёсьць 400 неразгледжаных заяў. Між тым, выбарчая кампанія хутка распачынаецца. Ячэйка не сачыла за выкананьнем дырэктыў аб зьнішэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў. У выніку гэтыя дырэктывы не ажыцьцёўлены. Фармальна і казённа аднеслася да сацыялістычнага спаборніцтва. Пытаньне аб інфармаўце было толькі абмеркавана на сходзе. Больш у гэтым напрамку ячэйка нічога не зрабіла. Парткіраўніцтва работай грамадзкіх арганізацый і мясцкому не адчуваецца.

Раённы камітэт ня досыць цікавіўся выяўленьнем сапраўднага стану і ня ведаў аб тых хваравітых зьявах, якія мелі месца ў ячэйцы. А між тым, як мы ўжо адзначалі, у мінулым у ячэйцы былі сур'ёзнейшыя прарывы: бытавое разлажэньне адных камуністых і замаваньне недахопаў і агідных непартыйных спраў гэтых членаў ячэйкі з боку рашты партыйцаў. Зараз асноўным недахопам ячэйкі зьяўляецца адсутнасьць самакрытыкі, выпадкі п'янства і бюракратызму. Праверком ужыў усе захады да аздараўленьня ячэйкі. 20 проц складу ячэйкі выключана з партыі (8 чал.). З партыйцы атрымалі суровыя партспагнаньні. Падамо найбольш характэрныя тыпы партыйцаў, якіх праверком за розныя непартыйныя ўчынкі выключылі з партыі.

Ёлін М. — арганізатар п'яных оргій у сябе на кватэры. Папойкі ня толькі абмяжоўваліся колам сваіх асоб, п'янствавалі і на кватэры асуджанага, але датэрмінова вызваленага забойцы Пашэка з удзелам некаторых артыстак Белдзяржтэатру і прастытутак. П'янствавалі ў прытонах, сталоўках, шынках. ацягваючы ў гэта непрабуднае п'янства асобных супрацоўнікаў ЦВК.

Брушкоў А. — ініцыятар збору грошай на царкву пры праезьдзе Мікалая II праз Бабруйск. Утаіў кулацкую гаспадарку сваіх братоў. Утаіў ад партыі твар свайго сваяка, былога эсэра, які пралез у партыю. Да партыйных абавязкаў Брушкоў адносіўся фармальна.

Красьцін Ф. — выключаны з партыі за п'янства і дэбошы.

Каркліна С. — выключана за пасыўнасьць, як баласт.

Бюро ячэйкі не змагалася з гэтымі зьявамі. Сакратар ячэйкі **Корф** атрымаў суровую вымову. У выніку чысткі ячэйка будзе аздароўлена.

Ф. НІКАНОРАЎ.

Слаба змагаліся з апартунізмам на практыцы

Скончана праверка партыйнай ячэйкі мэдфаку БДУ. Ячэйка ў сваёй асноўнай масе зьяўляецца здаровай. Але побач з гэтым у практычныя ячэйкі былі некаторыя недахопы і хібы.

Слабая пралетарская праслойка на факультэце, паяўнасьць вялікай колькасьці непралетарскіх элемэнтаў спрыяла ўзьнікненьню на мэдфаку антыпралетарскіх, ідэалёгічна-варожых і шкодных настрояў. Адначасова з агульным здаровым палітычным станам факультэту, ростам палітычнай грамадзкай актыўнасьці асноўнай масы студэнцтва, заўважваўся рост актыўнасьці варожых элемэнтаў, якія трапілі на факультэт. Гэта адлюстравалася ў замаскаваных выступленьнях супроць правядзеньня правільнай лініі на мэдфаку, у антысэміцкіх і шавіністычных вылазках, у праявах антымарксіцкай ідэалёгіі і г. д. Ячэйка своячасова змагалася з гэтымі фактамі. Ячэйка рашуча рэагавала на дэзарганізатарскую работу трацкісцкіх элемэнтаў на факультэце і дала своячасовы бязьлітасны адпор контр-рэвалюцыйнаму трацкізму.

Вялікім недахопам ячэйкі зьяўляецца тое, што яна слаба разгарнула барацьбу з правымі права-апартуністычнага ўхілу на практыцы. Маса партыйцаў у гэтую работу ня была ўцягнута. Як гэта ня дзіўна, але многія члены ячэйкі палітычна няпісьменныя, што ў некаторай ступені тлумачыць паяўнасьць слабой барацьбы з правым апартунізмам на практыцы.

Самакрытыка і крытыка на мэдфаку ўвесь час былі не разгорнуты.

Камісія адначыла відавочную работу ячэйкі па пралетарызацыі мэдфаку. У выніку ў гэтым-жа годзе па факультэце павялічылася пралетарская праслойка. Ёсьць некаторыя дасягненьні ў вылучэньні маладых пралетарскіх кадраў на пашуковую работу.

Праверком таксама падкрэсьліў слабую барацьбу ячэйкі з бюракратызмам і багацьцем лябараторыі Гэнры Форда і Томаса Эдысона.

Палепшыць пастаноўку справы ў с.-г. акадэміі

С.-г. установы ў гэтым годзе бяруць на пастаянную работу яшчэ ня скончыўшых студэнтаў і, ня гледзячы на гэта, усё-ж значная частка месц на раёнах зьяўляецца вакантнай. Гэта сьведчыць аб вялікім недахваце с.-г. спэцыялістых.

Зразумела, што ў асноўным пастаўшчыком высока - кваліфікаваных с.-г. спэцыялістых зьяўляецца Беларуская дзяржаўная с.-г. акадэмія імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яна выпусьціла агранамаў па гадох:

у 1925-26 г. — 139, у 1926-27 г.—76, у 1927-28 г. — 89.

Гэты выпуск зусім не адпавядае росту аграмадзканая сельская гаспадаркі і яе запатрабаваньню ў спэцыялістых.

Перабудова навучальных пляноў і праграм і наогул перабудова ўсёй работы ВНУ адстала ад запатрабаваньняў і жыцьця на 3-4 гады.

Курс с.-г. калектывізацыі ўведзены толькі з 1927-28 навучальнага году, правядзеньне яго пастаўлена яшчэ зусім дрэнна. Бесьперапынная практыка адсутнічае, мэтад выкладаньня — лекцыйны, які трэба зьмяніць на больш актыўны, масавая культурна-выхаваўчая работа праводзілася слаба ў сувязі з адсутнасьцю клюбу, выкладаньне грамадзкіх дысцыплін патрабуе шмат лепшага. Многа прадметаў выкладаецца «наезьнікамі» (прафэсурай, якая наяжджае). Адгэтуль ясна, што мы маем спэцыялістага, ня зусім добра падрыхтаванага з акадэмічнага боку, а таксама і з боку ідэалёгічнай вытрыманасьці.

У 1928-29 навучальным годзе мы маем зьніжэньне процанту здаўшых выпускім і павялічэньне процанту пакіданьня на другі год на старым курсе.

Гэта сьведчыць аб зьніжэньні прадукцыйнасьці працы студэнта, аб марудным тэмпе прахаджэньня навучаньня ў акадэміі, што зусім не адпавядае пастановам ліпнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб паскарэньні і паляпшэньні падрыхтоўкі новых кадраў.

А. СЯРМЯЖКА.

Улічым практыку Уралу

Зараз вялікую цікавасьць набывае праект стварэньня кадраў для калгасаў з саміх калгаснікаў на тэрыторыі калгасаў. Праект гэты высунуты на Урале ў калгасе «Гігант».

Паводле гэтага праекту, кадры для калгасаў павінны папаўняцца з асоб, якія канчаюць сяэдняю школу. Для гэтага школа II-й ступені павінна быць рэарганізавана і роўналежна з агульнай асьветай павінна даваць і спэцыяльную падрыхтоўку. У апошні год навучаньня вучні, выбраўшы тую ці іншую спэцыяльнасьць, павінны выканаць самастойную практычную работу ў гэтай галіне. Пасьля гэтага яны набываюць тую ці іншую кваліфікацыю. Гэта новага тыпу школа— калгасвуч — павінна кожны год выпускаць кваліфікаваных паляводаў, гароднікаў, садаводаў, птушкаводаў, пчаляроў, трактарыстых і г. д.

Вучні, якія скончылі школу II-й ступені і не жадаюць спэцыялізавацца ў паказанай вышэй галіне, не застаюцца на апошні год навучаньня, а пераходзяць у іншыя навучальныя ўстановы тыпу тэхнікумаў. Гэтыя тэхнікумы з 3-х гадовым курсам навучаньня выпускаюць у залежнасьці ад свайго ўхілу рад прадаўнікоў, у тым ліку палітасьветнікаў, пэдагогаў для 1-й ступені, дашкольных прадаўнікоў, статыстыкаў, рахункаводаў і бухгальтароў.

Гэты праект бязумоўна заслугоўвае пільнае ўвагі і вывучэньня. Яго ажыцьцяўленьне дасьць у бліжэйшыя-ж гады патрэбныя калгаснаму руху кадры.

Забойства сакратара сельсавету

КОЙДАНАВА (наш кар.). Яшчэ ў 1928 годзе кулакі зарэзалі коняй сакратара Бароўскага сельсавету **Бэсмана**, які актыўна праводзіў партыйную лінію на вёсцы. Менская пракуратура і судовыя органы не надалі тады справе палітычнага значэньня, народны суд вельмі мякка асудзіў тэрарыстых.

Зараз кулакі пайшлі на адкрыты тэрарыстычны акт. Бэсман забіты стрэлам праз вакно. Кулякі падпаілі бедняка, які згадзіўся забіць Бэсмана.

Беднякі і сераднякі Койданаўскага сельсавету патрабавалі вышэйшай меры пакараньня забойцы і яго патхніцеляў.

Аршаншчына ня выканала пляну ільназагатовак

Вінаватыя прыцягваюцца да адказнасьці

ВОРША. (Наш кар.). Аршанская округа да 1-га студзеня павінна была выканаць гадавы плян загатовак ільну-валакна на 80 проц. Гэту дырэктыву перавыканалі толькі два раёны — Круглянскі на 90 проц. і Талачынскі — на 86 проц. Іншыя раёны дырэктывы ня выканалі.

Наогул, округа выканала заданьне па ільназагатоўках да 1 студзеня толькі на 62 проц.

Прэзыдыум АВК вынес папярэджаньне ўсім райвыканкомам. Акруговай РСІ даручана прыцягнуць да адказнасьці за невыкананьне дырэктыў праўленьне акрсельсаюзу і кіраўнікоў Аршанскага аддзяленьня Дзяржгандлю.

ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ СЕЛЬГАСПКАДРАЎ

Падрыхтоўка спэцыялістых моцна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва

СЕЛЬ.-ГАСП. АСЬВЕТА ЯШЧЭ НЕ АДПАВЯДАЕ ЗАДАЧАМ РЭКАНСТРУКЦЫІНАГА ПЭРЫЯДУ

Ці трэба адкрываць новыя с.-г. тэхнікумы?

і Да канца пяцігодкі БССР трэба мець каля 20.000 спэцыялістых сельскай гаспадаркі.

Як-жа ў нас справа з вырашэньнем гэтага пытаньня? Возьмем для прыкладу сельска - гаспадарчы тэхнікум у Барысаве.

За сем год існаваньня тэхнікуму ўсяго выпушчана спэцыялістых сярэдняй кваліфікацыі 57 асоб, на якіх у год траціцца ў сярэднім 33.000 руб., ня лічачы новых пабудоў, вялікіх рамонтаў і г. д.

Такім чынам, мы трацім вялізныя сумы, а выпускаем адзінкі, якія зусім няпрыкметны для перабудовы сельскай гаспадаркі. Гэткі малюнак па тэмпе выпуску існуе і ў іншых тэхнікумах Беларусі, бо, згодна норм прыёму НКА, прымаецца кожны год па 30 асоб і толькі ў гэтым годзе — 40.

Адгэтуль зразумела, што пры нашым тэмпе падрыхтоўкі мы задачу падрыхтоўкі патрэбных нам кадраў у колькасных адносінах ня выканаем.

Дзе-ж выхад, які шлях трэба шукаць, каб уніхнуць дэфіцыту?

НКА знаходзіць выхад у адкрыцьці новых тэхнікумаў (як напрыклад, тэхнікум калектыўнага зямляробства ў Канічах), устанаўляючы і тут таксама норму прыёму 40 асоб. Адпускаюцца тысячы на абсталяваньне, а патрэбны яшчэ дзесяткі тысяч, каб зрабіць крыху здавальняючае абсталяваньне, хаця-б у такіх тэхнікумах, як Стара-Барысаўскі і інш.

Я лічу, што гэты мэтад падрыхтоўкі кадраў — ёсьць мэтад саматужны, што ён не адказвае тым задачам, якія зараз прад'яўляюцца да спэцыялістых. Па маёй думцы, трэба **мінімум патрэбіць прыём у існуючыя тэхнікумы.** Для гэтага пры бесьперапынцы патрабуецца ў кожным тэхнікуме ўсяго пабудаваць адзін-два будынкі, будуць скарочаны выдаткі ў 5-10 раз і будзе наступная выгада.

1. Канцэнтрацыя абсталяваньня.
2. Канцэнтрацыя лепшых спэцыялістых — выкладчыкаў (якіх у нас бясспрэчна мала), лепшая іх кваліфікацыя, бо яны тады будуць мець магчымасьць выкладаць толькі адзін прадмет, а не 3-5, як зараз.

Адгэтуль, зразумела, ва многа раз палепшыцца і якасьць выпушчаных спэцыялістых.

М. ДАРОЖКІН.

ПАСКОРЫМ ВЫПУСК АГРАНОМАЎ

Улічваючы недахват аграномаў для разгорнутага калектыўнага будаўніцтва, а таксама і магчымасьці ў сэнсе падрыхтоўкі кадраў, я прапаную: зрабіць выпуск 3-га курсу аграфаку бел. дзярж. С-г. акад. да 1-га лістапада 1930 г., для чаго трэба: папершае, пасьля зімовых канікул распачаць заняткі на 3-м курсе цыклавым мэтадам, каб мець магчымасьць скончыць апошнія да 15-га красавіка 1930 г.

Падругое, усім студэнтам 3-га курсу аграфаку з 15-га красавіка па 1-га чэрвеня, выехаўшы на раёны, прыняць удзел у веснавой пасеўнай кампаніі, што адначасова павінна зьявіцца і вытворчай практыкай.

Па трэцяе, з 1-га чэрвеня распачаць заняткі з студэнтамі 3-га курсу па прадметах 4-га курсу і скончыць апошнія да 1-га лістапада 1930 г. Да гэтага дадаю, што заняткі на 4-м курсе павінны праводзіцца таксама цыклавым мэтадам, у сувязі з чым ёсьць магчымасьць ня зрываць летніх водпускаў пэдагагічнаму парсаналу. Пяцімесячны тэрмін у летні час і пры цыклавым мэтадзе выкладаньня дасьць магчымасьць дэтальна прапрацаваць прадметы 4-га курсу.

Такім чынам, ня зьніжаючы якасьці прадукцыі, мы паскорым падрыхтоўку кадраў для сельскай гаспадаркі.

К. ВІТКОЎСКІ.

Лясную сярэднюю асьвету трэба рэарганізаваць

(У парадку абгаварэньня)

Пры вырашэньні пытаньня аб кадрах для лясной гаспадаркі НКА становіцца на шлях павялічэньня колькасьці школ. Гэты прынцып арганізацыі сярэдняй лясной асьветы сябе не апраўдвае па наступных меркаваньнях.

Распыленасьць школ выкліча або празьмерныя выдаткі, або прымусіць школы абмежавацца саматужным абсталяваньнем, што мы маем зараз.

Пры цяперашняй нястачы спэцыялістых стварэцца распыленасьць сіл выкладчыкаў. Універсалізм выкладчыкаў, што выклікаецца распыленасьцю школ, ня можа даць патрэбнага эфэкту і якасьці выкладаньня. Адарванасьць выкладчыкаў ад вытворчасьці пагражае адставаньнем іх ад практычных запатрабаваньняў гаспадаркі.

Распыленьне гаспадарча - адміністрацыйных выдаткаў зьяўляецца мерапрыемствам досыць нерацыянальным. Як паказвае практыка, лябараторыі і ўсё іншае навучальнае абсталяваньне скарыстоўваецца ня больш, як на 20-30 проц.

Адсутнасьць у НКА уласнай вытворчасьці, патрэбнай для лясной школы, і немагчымасьць плянавай увязкі з работай вытворчых арганізацый станіць пад пагрозу ажыцьцяўленьне дырэктыў лінёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб бесьперапынным вытворчай практыцы. Практыкуемая сыстэма фармальнай прыпіскі лясьніцтваў да навучальных устаноў, як паказвае практыка, сябе не апраўдвае, бо існуючая ўвязка паміж лясьнымі школамі і прыпісанымі навучальнымі лясьніцтвамі ня носіць вытворчай дзелавой сувязі.

Выходзячы з вышэйпералічаных меркаваньняў, мы лічым, што для выкананьня дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы кадраў лясных спэцыялістых сярэдняй кваліфікацыі павінны класьціся ў аснову **павялічэньне працыкной здольнасьці навучальных устаноў і сапраўднае набліжэньне іх да вытворчасьці.**

Павышэньне прадукцыйнасьці працы на нашых фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах найбольш часта дасягаецца: а) увядзеньнем бесьперапынкі ў вытворчасьці і б) рацыянальнай пастаноўкай самога працэсу вытворчасьці, у прыватнасьці, увядзеньнем канвэрнай сыстэмы.

У праламленьні да навучальнай установы бесьперапынка ў вытворчасьці выявіцца ўвядзеньнем бесьперапыннага тыдню і бесьперапыннага навучальнага году; канвэрная сыстэма, якая цалкам апраўдала сябе на вытворчасьці, аноўдзе сваё выяўленьне ў выглядзе цыклавой сыстэмы навучаньня. Сутнасьць яе, як вядома, зводзіцца да таго, што ўсе прадметы па навучальным пляне разьмяркоўваюцца на групах (цыклях); для прахаджэньня кожнага цыклю прадметаў адводзіцца пэўная колькасьць дзён або тыдняў, эквівалентная гадзінам па навучальным пляне.

З мэтай перамогі труднасьцяй, якія выцякаюць з адлегласьці месц вытворчай практыкі ад навучальнай установы, прахаджэньне цыклаў спэцыяльных прадметаў трэба перанесьці на адпаведныя вытворчасьці: у лес, лясьніцтва, канцылярыю, лесапільныя, смалярныя заводы і г. д.

Пры гэтых, патрэбных для школы вытворчасьцях, павінны быць добра абсталяваны лябараторыі для тэарытычнай

Тэарытычныя часткі курсу ставяцца ў цесную сувязь з вытворчасьцю: аспрацаваўшы тэорыю па тэй ці іншай галіне, вучань школы адпрацоўвае на гэтым прадпрыемстве вытворчую практыку, выконваючы карысныя функцыі вытворчасьці. Некаторыя часткі былога тэарытычнага курсу, напрыклад, справаводзтва, рахункаводзтва, у большай сваёй часьці лясная культура, лесаэксплёатацыя, лесапільная, смалярная вытворчасьць, падсечка праходзяцца выключна на практыцы. Д. Граннкоўскі, Д. Фомкін

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Інструктар Наркамзему Загароўскі зьбіваў рабочых

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Акруговы суд разгледзеў справу інструктара-рэвізора НКЗ **Загароўскага**, які ў часе абсьледваньня мэліяратыўных работ у Брагінскім раёне дазволіў сабе груба зьнішчаць рабочых.

Маладога хлапца Малочка, які паставіў рэйку не на належнае месца, Загароўскі ўдарыў два разы па твары. 15-ці гадовую дзяўчыну Уласенка, якая па неасьцярожнасьці паваліла калочак, «спэц» вылаяў самымі ганебнымі словамі.

Сяляне, якія працавалі на падрыхтоўчых работах, вынесьлі на сходзе пратэст супроць учынкаў Загароўскага.

Пратакол сходу быў пасланы ў Наркамзем, але апошні нічога не прадпрыняў супроць Загароўскага.

Толькі пасьля зьмяшчэньня ў «Полеской Правде» адпаведнага артыкулу, справе быў даны належны ход.

Акруговы суд прыгаварыў Загароўскага да пазбаўленьня волі на 1 год і тут-жа ўзяў яго пад варту.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Для ўзмацненьня падрыхтоўкі да веснавой сяўбы Бабруйскі АК мабілізаваў 149 камуністых, якія гэтымі днямі выяжджаюць у раёны.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Пачаліся заняткі на курсах па падрыхтоўцы рабочых, якія едуць у калгасы. На курсах займаецца 60 чал. Заняткі працягнуцца да 25-га студзеня.

МАЗЫР. (Наш кар.). На 1-е студзеня г. г. пад калгасамі занята 58,9 проц. зямельнай плошчы Каралінскага раёну. Пачаўся масавы ўлік і абагульненьне маемасьці гаспадарак, якія ўвайшлі ў калгасы.

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Нарада пры акрпрафбюро пастанавіла вылучыць для ўдзелу ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы 120 рабочых. Найбольшую колькасьць брыгад пасылаюць чыгуначнікі —20 чал. Саюзныя арганізацыі аплачваюць брыгадзірам 50 проц. камандыроначных. Для кіраўніцтва брыгадамі вылучана 5 адказных прафпрацаўнікоў.

МАЗЫР. (Наш кар.). Група мазырскіх партыйцаў - прапагандыстых з 12 чал. абвясьцілі сябе мабілізаванай для падрыхтоўкі кадраў калгаснікаў. Група адмовілася ад ганарару за чытку лекцый на курсах па падрыхтоўцы к

Ад палітыкі абмежаваньня—да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы

Кулак імкнецца сарваць падрыхтоўку да сяўбы

Кулак шалёна супраціўляецца калгаснаму будаўніцтву

«.... Цяпер мы маем магчымасьць павесьці рашучае наступленьне на кулацтва, зламаць яго супраціўленьне, ліквідаваць яго як клясу, і замяніць яго вытворчасьць вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў. Цяпер раскулачваньне робяць самі бяднацка-серадняцкія масы, якія ажыцьцяўляюць суцэльную калектывізацыю. Цяпер раскулачваньне ў раёнах суцэльнае калектывізацыі ня ёсьць ужо простая адміністрацыйная мера. Цяпер раскулачваньне складае там частку арганізацыі і разьвіцьця калгасаў. Вось чаму сьмешна і нясур'ёзна «распространяться» цяпер аб раскулачваньні. Зьнявіўшы галаву, па валасох ня плачуць»...

(З прамовы т. Сталіна на ўсесаюзнай канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых)

Кулакі і шкоднікі ў калгасах

Грэскі раён (Меншчына) самы далёкі ад акруговага цэнтру. У р-не ёсьць значная частка стальпінскіх і прышчэпаўскіх хутароў. Але, ня гледзячы на гэта, бяднацка-серадняцкая частка насельніцтва раёну ўжо зразумела перавагу калгасаў над дробнай сялянскай гаспадаркай. Зараз у раёне няма ні адней вёскі, дзе-б не гаварылі пра калгасы і калектывізацыю.

Вясной гэтага году калгасамі было ахоплена ўсяго 2 250 гэкт. Але за апошні месяцы гэта лічба значна ўзрасла. **Калгасамі ўжо ахоплена 13.975 гэкт., або 15 проц. агульнай плошчы раёну.**

Нядаўна адбыўся пленум райвыканкому, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб хутчэйшай калектывізацыі раёну. Пленум вызначыў ашчэ 7 сельсаветаў для суцэльнай калектывізацыі. Грэзаўскі сельсавет ужо на 60 проц. калектывізаваны.

Рост калектыўнага будаўніцтва ў Грэскім раёне праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулакі і заможнікі актыўна выступаюць супроць калектывізацыі.

Нядаўна кулакі спалілі гумно селяніна ў вёсцы Мусічы за тое, што ён запісаўся ў калгас. У Кукаўскім сельсавеце кулакі адрэзалі язык у каровы бедняка за актыўны ўдзел у калектывізацыі і ў вагатоўках збожжа.

У барацьбе з калгасамі кулак ужывае ня толькі адкрытыя дзеяньні, але часта перафарбоўваецца ў «бедняка», каб лягчэй пралезьці ў калгас і разбурыць яго з сярэдзіны.

Так, напрыклад, на мяжы Грэскага і Вузьдзенскага раёнаў у калгас пралезьлі кулакі, якія раней мелі па 50-60 гэкт. зямлі. Гэтыя «калгасьнікі» хаваюць у калгасе жывёлу вакольных кулакоў, якія індывідуальна ападаткаваны.

У калгас «Колас», Шышчыцкага сельсавету, нядаўна пралез індывідуальна ападаткаваны кулак Смольскі. Прыбыўшы ў калгас два дні і атрымаўшы даведку, што ён член калгасу, Смольскі пашоў у РВК дамагацца вызваленьня ад індывідуальнага падатку. Але тут ён быў выкрыты.

На жаль, мясцовыя работнікі, члены сельсавету, нават камуністы, не заўсёды даюць належны адпор гэтым кулацкім хітрыкам. Ёсьць і такія, што агітуюць за ўступленьне кулакоў у калгасы.

Мясцовая партыйная арганізацыя павінна даць рашучы адпор гэтым праяўленьням правага ўхілу ў практычнай рабоце.

ЯУХІМЧЫК.

БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ ПАД ШЫЛЬДАЙ КАЛГАСУ

У Клімавіцкім раёне па абодвы бакі Маскоўска-Варшаўскае шашы раскінулася вёска Сялец.

У гэтай вёсцы засела група кулакоў, і белагвардзейцаў, якія да рэвалюцыі мелі ад 25 да 300 дзес. зямлі, мелі паёмных батракоў. Зразумела, што савецкая ўлада прышлася ім не па гусьце. Большая частка з іх індывідуальна ападаткавана.

На 12-м годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі «гэтыя сяляне» парашылі арганізаваць калгас. Але, што гэта за калгас? Вось яго члены: былы памешчык Косьцін, буйныя кулакі Нічыпар Грыновіч і браты Какошнінскія, былы афіцэр Падабед і г. д. Каб лягчэй было пралезьці ў калгас, гэтыя «сяляне» пачалі прадаваць сваю жывёлу і маемасьць і перафарбаваліся ў «беднякоў». Не адстаюць ад іх і падкулачнікі Рабцаў В. і Мікіта Кашо. Да рэчы кажучы, гэты самы Рабцаў да рэвалюцыі меў у Менску ўласны рэстаран.

«Пакіну аднаго каня і карову, тады мяне ня будуць лічыць кулаком, прымуць у калгас і нават дапамогуць»

Уся кампанія вядзе сярод вакольнага сялянства агітацыю за разбазарваньне жывёлы.

«У калгасе ўсё роўна добрая жывёла не патрэбна, прадавай добрую, купляй горшую»—вось іх лёзунг, вось іх тактыка.

ЧАШНІКАЎ

У барацьбе за калгасы

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Вынікі калгаснага будаўніцтва на Магілеўшчыне за апошнія 6 месяцаў выразна сьведчаць аб тым, што акруга цьвёрда ідзе па шляху разгортваньня сацыялістычнай перабудовы вёскі і будаўніцтва буйнага сацыялістычнага земляробства. Зараз у акрузе арганізоўваюцца ня толькі буйныя калгасы, але цэлыя раёны перайшлі на суцэльную калектывізацыю (Клімавіцкі, Чэрыкаўскі і Крычаўскі).

На Магілеўшчыне нараджаецца новая сацыялістычная вёска.

Будаўніцтва сацыялістычнага земляробства ў акрузе адбываецца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Зразумела, што суцэльная калектывізацыя нясе з сабою сьмерць кулацтву. Буйны калгас, які абагуліў асноўныя сродкі вытворчасьці, выкідвае са свайго аэродзішча кулакоў і пачынае ўжо весьці наступленьне на вакольныя кулацкія элемэнты.

Кулак зараз вядзе жорсткую барацьбу супроць сацыялістычнай перабудовы вёскі, супроць будаўніцтва калгасаў, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Кулацтва нават выходзіць на дарогу з адрэзамі, страляе праз вокны ў лепшых барацьбітоў сацыялістычнага будаўніцтва. Вось факты.

Гэтымі днямі ў Вепрынскім сельсавеце, Чэрыкаўскага раёну, 7 кулакоў арганізавалі спэцыяльную нараду, пасьля якое накіраваліся да памяшканьня сельсавету з крыкамі: «бі беднату і калектывістых», «дайце нам тых, хто рабіў раскладку збожжа».

Не застаўшы нікога ў сельсавеце, бандыцкая зграя накіравалася ў хату бедняка Сабалёва, дзе ўчыніла сапраўдны разгром. **Сабалёў, яго жонка і дзеці былі пабіты кулакамі.** Зараз яны ляжаць у больніцы, дачцы Сабалёва азьвярэлыя кулакі пераламалі руку.

У вёсцы Ляхаўшчына, Чавускага раёну, ня так даўно стрэлам праз вакно кулакі хацелі забіць агранома - калгасьніка — ініцыятара калектывізацыі, але куля праляцела міма. Аналёгічны выпадак быў у вёсцы Сколева гэтага-ж раёну, дзе стрэлам праз вакно кулакі хацелі забіць арганізатара калгасу—чырвонага партызана Кондалева.

Каля Дужаўскага сельсавету кулакі напалі на актыўнага члена сельсавету, калгасьніка і нажом зарэзалі яго.

Кулакі вядуць шалёную агітацыю супроць калектывізацыі, імкнуцца ўсялякімі мерамі запалохаць беднату і не дапусьціць арганізацыю калгасаў. На варотах бядняцкіх хат кулакі робяць надпісы з патрабаваньнямі, пагражаючы, у выпадку іх невыкананьня, падпалам.

У вёсцы Відуйцы, Касьцюковіцкага раёну, дзе арганізаваўся калгас «Іскра», арандатары млыну — кулакі адмаўляюцца малоць збожжа сялянам, якія ўступілі ў калгас. «Ідзі малоць у камунію»... адказваюць яны калгасьнікам.

Такіх прыкладаў шмат.

Беднята і сераднякі зараз масамі ўступаюць у калгасы. Беднята і сераднякі ўсё больш і больш згуртоўваюцца вакол камуністычнай партыі і даюць рашучы адпор кулацтву. На радзе сходаў беднякі і сераднякі патрабуюць, **каб упада прыняла рад мер супроць кулакоў, шкоднікаў калектывізацыі. Бяднацка-серадняцкія сходы патрабуюць, каб кулакі былі выселены з тэрыторыі калгасаў.**

Пара палажыць канец кулацкай агітацыі супроць калгасаў, трэба стварыць усе ўмовы для пасьпяховага разьвіцьця калгасаў у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

А. С.

„Добрыя" кулакі

У Азярыцкім раёне (Мазыршчына) мясцовыя працаўнікі дзеляць кулакоў на «добрых» і «дрэнных». На практыцы гэта тэорыя прывяла да таго, што ў камуну «Шлях Саветаў» былі прыняты 3 «добрыя» кулакі, адзін з іх нават мае паравы млын. У калгас каля вёскі Ламавічы прыняты кулак, пазбаўлены выбарчых праў. У калгас «Новы Бобрык», Пятрыкоўскага раёну прыняты 4 «добрыя» кулакі, індывідуальна ападаткаваныя.

Азярыцкія працаўнікі не знайшлі іншага шляху для барацьбы з кулаком, як прыём яго ў калгасы. Калі было высунута пытаньне аб выключэньні гэтых кулацкіх элемэнтаў з калгасаў, мясцовыя працаўнікі сустрэлі яго ў штыхі.

Трэба моцна ўдарыць па такіх кіраўнікох, па такім выразным праяўленьні правага ўхілу на практыцы.

П.

З ЭВАНГЕЛЬЛЕМ У РУКАХ

Вёска Вяліцыны два гады таму назад перажыла прышчэпаўскае зямляўпарадкаваньне. Вёска была разарвана на невялікія пасёлкі і хутары.

На беразе невялічкага возера ў 3 клм. ад былой вёскі раскінуўся пасёлак «Чырвонае Возера». Пасёлак яшчэ не адбудаваўся. Радам з пабудаванымі хаткамі, стаяць будынкі бяз стрэх, бяз віль чыкаў. Каля дамоў раскідана шмат будаўнічага лясного матар'ялу. Рэха сякер разносіцца ў марозным раньні. Сяляне дабудоўваюць свае хаты.

Прайшоўшы кароткую вуліцу адразу можна заўважыць, што пасёлак жыве неспакойным жыцьцём.

У вочы кідаюцца белыя абшыляныя дамы. Іх ня многа, але прыбраны, прыгожы выгляд іх вабіць да сябе. Вокны ў гэтых дамох вялікія, чыстыя прыгожыя, як і вароты, парканы і інш.

Мімаволі пераводзіш погляд на суседнія хаты. Яны хоць у большасьці і новыя, але стаяць неяк панура, як-бы уросшы ў зямлю, з маленькімі вакенцамі, шыбы якіх абрасьлі густым пластом ільду. У дварох гэтых хат ня відаць цёплых хляваў для жывёлы. Каровы і коні стаяць пад саломенымі паветкамі, калочыцьмя ад марозу.

Чаму такое разыходжаньне? Чаму частка дамоў добра пабудавана і абсталявана, чаму другая, пераважная частка, знаходзіцца ў такім няпрывабным стане?

На гэтае пытаньне можна адказаць толькі добра азнаёміўшыся з усім тым, што зьвязана з жыцьцём пасёлку.

***

Спачатку было так.

Сяляне пакінулі вёску і перайшлі на пасёлак. Пасялкоўцы з начуванай упартасьцю і энэргіяй узяліся за работу. Дабіліся лесабудаўнічых матар'ялаў, крэдытаў на с.-г. машыны, жывёлу і будынкі.

Але частка беднаты хутка пераканалася ў тым, што пасялковае жыцьцё нічым ня лепш за вясковае. Беднята ўбачыла, што пасёлак быў выгодным толькі «некаторым»,—кулакам і заможнікам, гаспадаркі якіх расквітнелі пышнай кветкай на новай зямлі. Кулакі ня толькі пабудавалі новыя дамы, але і пабудавалі сродкі вытворчасьці, жывы і мёртвы інвэнтар.

Кулаком дасталіся лепшыя кавалкі зямлі, лепшая сенажаць і ўсё лепшае, што было ў пасёлку.

Частковы неўраджай улетку апошняга году значна пагоршыў становішча беднаты. Беднята была вымушана шукаць пабочных заработкаў. Каб падтрымаць сваё існаваньне. Ішлі на лесараспрацоўкі, на чыгунку.

Сталі ўсё часьцей гаварыць аб перасяленьні ў далёкую Сібір. Беднята невялічкімі групкамі зьбіралася на прызбах і абмяркоўвала сваё становішча Сібір вабіла да сябе, як спакуснае, але невядомае месца. Сталі зьбірацца пасляць хадака на далёкую поўнач...

***

А ў гэты час Хойніцкі раён ахапіла рэвалюцыя. На абшарах палаў пачалі расьці калгасы. Процант калектывізаванай плошчы рос у раёне з кожным днём. Разгарвалася клясавая барацьба. Беднята адточвала зброю супроць кулацтва, якое змагалася супроць калгасная будаўніцтва. І, нарэшце, кулак пашлі гуртом у калгасы, каб разбурыць іх з сярэдзіны.

У пасёлак «Чырвонае Возера» з Чырвонай армії вярнуўся дэмабілізаваны Тодар Гардзенчык. Тры дні ён хадзіў па хатах і пытаў пасялкоўцаў аб новым жыцьці. Тодара ахапіў смутак. Ён сустрэўся з тым, чаго ня чакаў у пасёлку.

Тодар пачаў зьбіраць беднату. Кожны вечар гаварылі доўга і спрачаліся горача. Гаварылі аб калгасах. Тодар даводзіў пасялкоўцам перавагу калгаснага жыцьця.

***

У пасёлку жылі кіраўнікі сэкты эвангелістых.

Два заможныя Краўчанка Сава і Гардзенчык Пётра кіравалі сэктай. Яны таксама прыходзілі на сходы і на гутаркі, якія праводзіў Тодар і да хрыпаты ў голасе даводзілі пасялкоўцам, што калгас гэта гняздо антыхрыстаў і бязбожных бальшавікоў.

«Сьвятыя браты» выступалі супроць калгасу рашуча з эвангельем у руках, але беднату ім пераканаць не ўдалося. Довады Тодара перамаглі—беднята пашла ў калгас.

***

У 12 гадавіну Кастрычніка адбываўся ўрачысты сход па арганізацыі калгасу «Чырвонае Возера». На сход зьявіліся эвангелістыя—кулакі і нечакана для ўсіх занесьлі свае прозьвішчы ў сьпіс калгасьнікаў.

... Сталі кароткімі дні і доўгімі ночы. Тодар узмоцнена працаваў. Цэлымі вечарамі тлумачыў пасялкоўцам аб усім тым, што зьвязана з калгасам.

Калгас афармляўся.

Сьвятыя браты прымоўклі, зрабіліся няпрыкметнымі ў агульнай сялянскай гушчы.

Склалі камісію для аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці. У нядзелю камісія павінна была прыступіць да работы, але...

... У суботу ўночы Пётру Гардзенчыку прысьніўся сон...

У нядзелю раніцой, калі яшчэ пасёлак быў ахутаны змрокам, Пётра і Саўка пайшлі з эвангельем у руках па хатах. Уваходзілі ў хаты і патаемным шэптам Пётра пачынаў расказваць.

... Сёньня я бачыў сон. Анёлы госпада бога зышлі на зямлю і панесьлі мяне на неба. Я стаяў перад богам. Ён пільна акінуў мяне сваім поглядам і запытаў: «Што-ж гэта ты, сын божы, зрабіў такі вялікі грэх...

Пётра захапляўся, цяжка дыхаў, вочы ў яго бліскалі і ён апавядаў, як зьдзек валіся над ім на небе, і што яму гаварыў бог.

— «Ён, урэшце, мне загадаў: вось табе, сын мой, эвангельле, ідзі на землю і прапаведуй яго перад братамі тваімі. Якія сагрэшылі перад богам, аддаўшы сваю душу антыхрыстам і паганцам, уступіўшы ў калгас».

— Ганеце паганцаў з зямлі рускаў, ня пускайце іх у сялянскія хаты, узбройвайцеся крыжам і эвангельлем божым супроць шатана.

Крыху перапыніўшыся, Пётра разгортваў эвангельле і пачынаў чытаць.

«Вясной 1930 году ад «рождества христова» расступіцца зямля, узбунтуецца вада і пачнецца крывапралітная бойня. Усе ўступіўшыя ў калгас загінуць, яко нечысьцьць і грэшнікі божыя. На зямлі застануцца людзі, якія не запрадалі сваю душу шатане і язычнікам—бальшавікам, якія не ўступілі ў калгасы. Яны будуць працягваць род чалавечы». І яшчэ, і яшчэ.

Сьвятыя браты—кулакі зрабілі сваю справу.

У калгасе «Чырвонае Возера» засталося з 27 гаспадарак толькі некалькі.

***

Калгасьнікі з суседняга калгасу «Бальшавік» сумесна з камсамольцамі і партыйцамі сельсавету хутка выкрылі палітыку «сьвятых братоў». Яны выразна растлумачылі пасёлкаўцам сутнасьць упартых дамаганьняў Пятра і Саўкі.

Зараз сьвятыя браты ўжо адмаўляюцца ад таго, што іх судзіў гасподзь бог, што яны былі на небе. Пётра Гардзенчык глядзіць спадлоб'я і не гаворыць, а неяк мізэрна мармыча.

— Нічога гэтага ня было. Усё мана.

Беднята і серадняцтва вярнулася ў калгас толькі без сьвятых братоў. І калгасьнікі аграмаджваюць маемасьць і рыхтуюцца далучыцца да суседняга калгасу «Бальшавік».

«Сьвятыя браты», мабыць, ня ведалі, што акрамя суду божага, ёсьць яшчэ суд пралетарскі, якога ім ня мінуць.

УЛ. МЯЖЭВІЧ.

Хойнікі, 3 студзеня.

Да ўсебеларускай выстаўкі

НЕДАЦУШЧАЛЬНА ПАВОЛЬНЫЯ ТЭМПЫ

Падрыхтоўка Меншчыны да ўсебеларускай выстаўкі ідзе надзвычайна слаба. Толькі чатыры раёны больш-менш здавальняюча разгарнулі падрыхтоўчую работу. Працоўныя Меншчыны зусім мала ведаюць аб надыходзячай выстаўцы

Падрыхтоўчая работа да ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ідзе надзвычайна павольна. Наяўпасьць далёка невыстарчальных тэмпаў падрыхтоўкі ставіць пад пагрозу выкананьне ўскладзеных на Меншчыну задач у галіне падрыхтоўкі да выстаўкі.

Упяршыню пытаньне аб усебеларускай выстаўцы стаяла на пасяджэньні прэзыдыуму Менскага акрвыканкому 9-га ліпеня 1929 г. Тады-ж быў створаны акрвыстаўком, прызначэньне якога —падрыхтаваць Менскую акругу да ўсебеларускай выстаўкі. Прайшло ўжо з таго часу больш за паўгода. Што-ж практычна зроблена да сёньняшняга дня па Меншчыне?

Плян удзелу акруці ў выстаўцы разасланы на месцы толькі 26-га сьнежня. Між тым, па ўсіх раёнах да першага верасьня былі створаны райвыстаўкомы. Зазначым, што пакуль дырэктыва акрвыканкому прыдыбала да райвыканкомаў і пакуль знайшла там сваё ажыцьцяўленьне, прайшло каля 2-х месяцаў.

Пытаньне аб усебеларускай выстаўцы ставілася на 15 пленумах райвыканкомаў, 198 пленумах сельсаветаў і 709 агульных сходах сялян. Яшчэ дадамо, што акрвыстаўком за шасьцімесячны тэрмін свайго існаваньня зрабіў 5 пасяджэньняў, на якіх разгледзеў 15 пытаньняў «накіраваных — як заяўляюць «выстаўкомаўцы» — на ўзмацненьне падрыхтоўчай работы да выстаўкі на мясцох».

Праверка падрыхтоўчай работы да выстаўкі, праведзеная ў 5 раёнах і 9-ці сельсаветах, выявіла, што на мясцох з-за недастатковасьці канкрэтных паказаньняў падрыхтоўка разгорнута слаба.

7 райвыстаўкомаў даслалі ў акрвыстаўком весткі аб іх практычнай рабоце да выстаўкі. Паводле гэтых вестак, адабрана для выстаўкі 136 экспанатаў расьлінаводзтва, 6 экспанатаў тэхнічнапрадзільных культур, 10 — па мэліярацыі, 10 — рукадзельля. Для гэтае работы выкарыстаны рэнныя выстаўкі, што былі наладжаны ў «Дзень ураджаю». Трэба адзначыць нядбайнасьць у адборы экспанатаў — некаторыя экспанаты зусім не адпавядаюць запатрабаваньням выстаўкі. **Ці варта гаварыць аб тым, што вынікі гэтай работы далёка нязначныя ў параўнаньні з тым, што трэба паказаць Меншчыне на ўсебеларускай выстаўцы?..**

Адпаведныя арганізацыі і ўстановы не пакланаціліся своячасова забясьпечыць раёны неабходнай літаратурай, з дапамогаю якое можна было-б лепш праводзіць папулярызацыю задач і значэньня выстаўкі.

Да гэтае пары некаторыя раёны амаль не праводзяць падрыхтоўчай работы. **Пухавіцкі і Бярэзінскі раёны абсалютна нічога яшчэ не зрабілі да выстаўкі.**

Адзінацацаць раёнаў акругі падрыхтоўчую работу вядуць надзвычайна слаба. Толькі па чатырох раёнах падрыхтоўка разгорнута больш-менш здавальняюча.

У акрвыстаўкоме і на мясцох зусім дрэнна пастаўлен улік мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да выстаўкі. Характэрна адзначыць, што на мясцох пануе тэндэнцыя — адкладваць усю работу на апошнія месяцы, на апошнія тыдні перад выстаўкай. Гэтай тэндэнцыі спрыяе і акрвыстаўком, які ня даў раёнам патрэбных канкрэтных паказаньняў, як лепш праводзіць папуляризацыю выстаўкі, падбор экспанатаў і г. д.

Акрвыстаўком матывуе слабасьць падрыхтоўкі да выстаўкі тым, што райвыканкомы зараз заняты ўдарнымі кампаніямі. **ТАКІЯ** адносіны акрвыстаўкому трэба кваліфікаваць, як неразумеьне задач выстаўкі.

Да гэтага часу па ўсёй Меншчыне не падабрана ніводнага экспанату па жывёлагадоўлі. Тут непаваротнасьць праявіла сама дырэкцыя выстаўкі, якая яшчэ не дала раёнам паказаньняў у гэтай галіне.

Патрэбны тэрміновыя захады па ўзмацненьні тэмпаў падрыхтоўкі да выстаўкі.

Прафарганізацыі, якія амаль нічога не зрабілі яшчэ да выстаўкі, павінны ўзяць на сябе рад абавязкаў у падрыхтоўчай рабоце. Яны не павінны застацца ў баку.

М. ВЯРНІКОЎСКІ.

Прарывы ў фінансавай рабоце на Бабруйшчыне

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Агляд фінансавых органаў Бабруйшчыны, праведзены камісіяй ЦКК-РСІ, выявіў рад прарываў у фінансава-падатковай рабоце.

Дырэктывы партыі аб наступленьні на прыватны сэктар выконваліся слаба і нерашуча. Мела месца значнае недаабкладваньне прыватнікаў.

Значную ролю ў недаабкладваньні прыватнага сэктару адыграў той факт, што апарат фінансавых органаў быў засьмечаны чужым элемэнтам, што асобныя працаўнікі зрашчваліся з прыватнікамі, што ў фінансавых органах партыйная і рабочая праслойка была вельмі слабая.

Вывады камісіі ЦКК-РСІ разглядаліся на пасяджэньні бюро Бабруйскага акругкому партыі, разам з прэзыдыумам АКК.

Бюро АК і прэзыдыум АКК ацанілі прарывы ў фінансава-падатковай рабоце, як **праяву правага ўхілу на практыцы.**

Загадчыку акрфа тав. **Шакалаву** за няпрыняцьце рашучых мер да перабудовы работы апарату пастаўлена на від.

Бюро ячэйкі акрфа абвешчана вымовэ. Гаркому даручана датэрмінова перавыбраць бюро.

Сакратару ячэйкі тав. **Казубоўскаму** абвешчана вымова з унясеньнем у асабістую справу.

Фракцыі саюзу савецкіх і гандлёвых служачых даручана правесьці датэрміновыя перавыбары мясцкому акрфа. Бюро Сьвіслацкага, Слуцкага і Парыцкага райкомаў зазначана на слабое кіраўніцтва фінансавай работай у раёне.

Справа аб б. загадчыку акрфа **Стаме** перадана Ленінградзкай КК, на месцы яго службы.

АВВЕСТКА

Для адбору 100 чал. для ПАСЫЛКІ на паўтара месяцы ў вёску па ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

ПРАПАНУЕЦЦА

усім ведамственым вучоўнікам

прафсаюзных, савецкіх, гаспадарчых, кааперацыйных і іншых цэнтральных установ

ЗЬЯВІЦЦА у ЦК КП(б)Б на 13 гадзіну, ПАКОЙ № 6. 13-га СТУДЗЕНЯ

з матар'ялам аб асабістым складзе адказных працаўнікоў-камуністых.

АРГ. АДДЗЕЛ ЦК КП(б)Б.

На пленуме ЦСПСБ

Мабілізаваць усю ўвагу саюзных мас на правядзеньні веснавой сяўбы

Даклад т. Калодкі

Учора на раніпнім пасяджэньні пленуму ЦСПСБ быў заслуханы даклад загадчыка арганадзелам ЦСПСБ т. **Калодкі** аб падрыхтоўцы прафсаюзаў да веснавое пасеўнае кампаніі.

Тав. Калодка адзначае, што ў гэтай працы прафсаюзы маюць яшчэ невялікі вопыт. Толькі ў мінулым годзе прафсаюзы сур'ёзна заняліся працаю на вёсцы і шмат зрабілі ў часе падрыхтоўкі да веснавое кампаніі 1929 году. Але вопыт мінулагодняе веснавое кампаніі не падагулены. З усяго матар'ялу, які знаходзіцца ў ЦСПСБ, нельга зрабіць больш-менш пэўных практычных вывадаў таму, што большасьць справаздач не паказвае на недахопы ўдзелу прафсаюзаў у веснавой кампаніі.

Усё-ж некалькі такіх адмоўных момантаў у матар'ялах мы маем. Першы недахоп — брыгады, якія выяжджалі ў вёску, ня былі дастаткова падрыхтаваны, а раённыя арганізацыі не змаглі поўнасьцю скарыстаць гэтых брыгад. Другі недахоп — уся работа прафсаюзаў па падрыхтоўцы да сяўбы ня была зьвязана з пляпамі раёнаў і сельсаветаў. Трэці — незаўсёды сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, якія прывозілі з сабою рабочыя брыгады, пападалі ў рукі беднякоў, былі выпадкі, калі машыны трапілі ў рукі кулакоў і заможнікаў. Далей — ня ўсе раёны былі ахоплены рабочымі брыгадамі, бо апошнія, ў большасьці выпадкаў, пасылаліся шэфскімі таварыствамі і толькі ў падшэфныя раёны. Між тым, былі раёны, не ахопленыя шэфскімі таварыствамі.

— Вось гэтыя недахопы, — кажа тав. Калодка, — мы павінны ўлічыць, пачынаючы падрыхтоўку да пасеўнае кампаніі 1930 году.

Спыніўшыся на задачах, якія стаяць перад прафсаюзамі ў вёсцы, тав. Калодка пераходзіць да практычных прапаноў.

Прафсаюзы павінны для выкананьня вялікае задачы — падрыхтоўкі да пасеўнае кампаніі — мабілізаваць усю ўвагу шырокіх прафсаюзных мас. Трэба шырокі папулярызаваць плян пасеўнае кампаніі, які зацьверджаны Саўнаркомам Беларусі 19-га сьнежня. Гэты плян трэба абавязкова паставіць на абгаварэньне праўленьняў саюзаў, прэзыдыумаў, пленумаў, фэзаўкомаў і г. д.

Рабочыя брыгады, якія пасылаюцца на вёску, павінны лепш падрыхтавацца і ўлічыць умовы кожнага раёну.

Прафсаюзы павінны зараз-жа пачаць масавую праверку работы ўсіх устаноў і арганізацый, якія рыхтуюцца да веснавое пасеўнае кампаніі, выявіць, наколькі праводзяцца ў жыцьцё намечаныя пляны. Прафсаюзныя ячэйкі і прадпрыемствы, цесна зьвязаныя з вёскай, павінны такім-ж праверкі правесьці ў саўгасах.

Шэфскія т-вы, пакуль што, працуюць ня зусім добра. Прафсаюзам трэба ўзяць над сваёй кантроль работу шэфтаварыстваў і даць ёй належны напрамак.

Трэба таксама праверыць, **што робіцца на прадпрыемствах, якія робяць сельска-гаспадарчыя прылады, як яны рыхтуюцца да пасеўнае кампаніі.**

Праз два тыдні мы пасылаем на вёску 500 рабочых-добраахвотнікаў на кіруючую работу ў калгасы. Але гэтага мала. Гэтымі днямі мы пачнем мабілізацыю яшчэ 500 працаўнікоў — рахункаводаў, з якіх 200 чалавек мы пашлем на сталую працу ў калгасы. Мы таксама мабілізуем ня менш 100 прафесыянальных працаўнікоў.

***

Па дакладзе тав. Калодкі выказалася каля 15 чалавек. Амаль усе адзначалі, што месцы яшчэ не пачалі рыхтавацца да пасеўнае кампаніі.

— Мы да гэтага часу ў галіне калектывізацыі працуем з «халадком», — кажа тав. Шмурыгін, — нашы візавыя праф'ячэйкі часта змазваюць гэта пытаньне. Такое становішча мы маем як па Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, па заводзе № 7, так і па іншых прадпрыемствах.

На Віцебскім заводзе «Чырвоны Мэталіст» нават не падагулілі вынікаў мінулагодняе пасеўнае кампаніі і не заслухалі справаздачы рабочае брыгады па пасяджэньні фабзаўкому, расказвае т. Ковенскі. Калі-ж тав. Ковенскі, як кіраўнік рабочае брыгады, прыпамянуў аб неабходнасьці зрабіць справаздачу перад рабочымі, заўком адказаў: «гэта пустое, у нас ёсьць больш складаныя справы».

— Не раскачаліся і на менскім заводзе «Камунар», — кажа тав. **Клячкін.**

На фабрыцы «Бобрыцэй», па словах тав. Кантарэніча, тыдні два назад выяжджала адна брыгада ў складзе 5 чалавек. Больш фабрыка нічога не зрабіла.

— Да сяўбы рыхтуемся слаба, нават у плянe работы заўкому гэтага пытаньня няма, — адзначае і тав. Ізох, з гуты «Пралетары» і г. д.

Аб тым, як кіруючыя шэфскія арганізацыі адносяцца да шэфства, расказвае тав. Бэрына, з Магілева. Цукеркавай фабрыцы на працягу аднаго году пяць раз мянялі падшэфную вёску. Не пасьпявалі рабочыя азнаёміцца з адной вёскай, зрабіць ёй першую дапамогу, як фабрыцы давалі іншую вёску для шэфства

***

Учора-ж, на раніпнім пасяджэньні быў заслуханы даклад т. **Табайніка** аб становішчы ліквідацыі лянісьменнасьці. Вечарам пачаліся спрэчкі па дакладзе. Сёньня раніцою плянуецца прыняць рэзалюцыі па ўсіх дакладах.

ЗЬНЯЦЬ ЗВАНЫ З ЦЭРКВАЎ І КАСЬЦЁЛАЎ, перадаць будынак чыгуначнай царквы пад клюб — ПАТРАБУЮЦЬ ШМАТЛІКІЯ СХОДЫ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ

Гарсавет павінен выканаць наказ чыгуначнікаў

На Менскім вузле МББ чыгунікі адбыўся рад сходаў, прысьвечаных пытаньню барацьбы з рэлігійным дурманам.

Сходы па ўсіх цэхах і мясцкомах вузла аднагалосна пастанавілі патрабаваць ад Менгарсавету выкананьня наказу пры выбарах у гарсавет аб закрыцьці чыгуначнай царквы.

Рабочыя чыгуначнікі таксама прапанавалі савецкім органам вырашыць пытаньне аб зьняцьці званоў і перадачы іх у фонд індустрыялізацыі.

Рабочыя чакаюць, што Менскі гарсавет задаволіць іх просьбу і ліквідуе ачаг дурману, які на працягу доўгіх гадоў атручваў сьвядомасьць рабочых і работніц менскага вузла.

***

На станцыі МЕНСК - ТАВАРНАЯ адбыўся сход рабочых і служачых, якія аб'ядняюцца мясцкомам № 2. Сход заслухаў даклад аб бесьперапынцы, быце і рэлігіі.

Агульны сход пастанавіў «самым рашучым чынам патрабаваць ад Менскага гарадзкога савету выкананьня пункту наказу аб перадачы памяшканьня чыгуначнай царквы пад клюб. Пара раз назаўсёды пакласьці канец тэй контррэвалюцыйнай прапагандзе, якая вядзецца пад прыкрыцьцём муроў «божага храму».

Званы ўсіх цэркваў і касьцёлаў, у прыватнасьці, званы чыгуначнай царквы, павінны быць пераданы ў фонд індустрыялізацыі краіны.

Аднагалосна прынята прапанова рабочага тав. Мураха аб тым, каб прасіць урад хутчэй выпусьціць першую пазыку калектывізацыі — пазыку сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Закрыць ачагі дурману

Агульны сход рабочых Менскага кахэльнага заводу, разам з вучнямі 15-ай школы і чырвонаармэйцамі №-га палка, пастанавіў прасіць Менскі гарсавет закрыць сынагогу, якая знаходзіцца капя 15-й школы, і адпаць яе памяшканьне пад клюб для дзяцей рабочых, якія вучацца ў школе.

На сходзе прысутнічала капя 200 чалавек.

Будынак Златагорскага касьцёлу—пад культустанову

У школе міліцыі імя Фрунзэ адбыўся агульны сход членаў ячэйкі «Бязбожнік» школы.

Сход патрабаваў закрыць Златагорскі касьцёл, які знаходзіцца побач са школай міліцыі, а таксама яўрэйскую сынагогу на Камароўцы, будынкі якіх павінны быць скарыстаны для культурнага абслугоўваньня працоўнага насельніцтва Камароўкі.

Алначасова сход патрабаваў зьняць званы з усіх цэркваў і касьцёлаў горада і скарыстаць іх на патрэбы прамысловасьці.

Калгасьнікі працавалі ў дзень калядаў

Калгасьнікі вёскі Забалацьце, Сьмілавіцкага раёну, адмовіліся сьвяткаваць старыя калядны. У дзень каляд усе калгасьнікі, як адзін, выйшлі з сякерамі і пілами на грамадзкую работу па перабудове памяшканьня пад сховы пункт.

Сяляне кажуць, што ў першы раз за ўсё жыцьцё яны працавалі ў дзень каляд.

Слупскі.

МЕНСК

У Чырвонай арміі

У 2-м артпалку ўважліва аднесліся да падбору кандыдатаў на курсы па падрыхтоўцы ў ВТНУ. Кандыдатуры вылучаных 7 чырвонаармейцаў і маладшых камандзіраў былі абмеркаваны на сходзе, што забяспечыла добры падбор іх.

С. СЯРДЗЮКОЎ.

* * *

Гэтымі днямі адбылася **першая канфэрэнцыя штабаў** па сацспаборніцтве вайсковых часьцей Магілеўскага, Быхаўскага і Чавускага гарнізонаў. Быў зроблен даклад камандзіра і камісара дывізіі аб вучобе і чарговых задачах дывізіі. Была выбрана камісія для выпрацоўкі генэральнага дагавору з 2-й дывізіяй. 47 дэлегатаў канфэрэнцыі абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

ТАМАШЭВІЧ.

* * *

— У кульроце АБВШ арганізаваны ўдарны кулямётны разьдзел, у які ўвайшлі 34 курсанты. Зроблен выклік ударным кулямётным аддзяленьням 1 роты школы на сацспаборніцтва на лепшае выкананьне ротных дагавораў па пытаньнях вучобы, дысцыпліны і г. д.

І. ФЕДАРОВІЧ.

* * *

— Дрэнна абстаіць справа ў № артпалку з працай грамадзкіх гурткоў. Маладыя чырвонаармейцы імкнуцца працаваць у розных гурстках, але-ж іх у палку няма. Няма і гуртка «бязбожнікаў», не вядзецца антырэлігійная работа, і наогул партбюро не зьвяртае належнай увагі на гэту справу.

С. К—с.

Арганізуюцца групы дапамогі рацыяналізацыі

Бюро рацыяналізацыі швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» (Менск) распрацавала статут груп дапамогі рацыяналізацыі вытворчасьці. Статут зацьверджаны дырэкцыяй фабрыкі і фабкомам і перададзены на абгаварэньне вытворчай камісіі.

У групу дапамогі павінны ўваходзіць рабочыя ўдарнікі і актывістыя, якія зарэкамэндавалі сябе ў сацспаборніцтве.

Групы дапамогі ў агрэгатах, цэхах і аддзяленьнях будуць сачыць за ўсімі недахопамі ў вытворчасьці, будуць дапамагаць рацыяналізацыі швэйнай фабрыкі. Гэтае мерапрыемства дазволіць падняць рацыяналізацыю фабрыкі на больш высокую ступень.

РОСЬЛІК.

ДА ВЕДАМА

ДЭЛЕГАТАЎ 1-ай МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ АГІТПРАПАГАНДЫСЦКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ МОПР'у, якая адкрываецца 21 студзеня у ДОМЕ ПРАЦАСЬЬЕТЫ

Мандаты выдаюцца з 12 студзеня штодзённа ў АК МОПР'у ад 7 да 9 гадз. увечары па даведках бюро ячэек МОПР'у.

Модус—1 дэл. на 50 членаў МОПР'у—чытачоў монпраўскай літаратуры.

МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

Пашыраем плянэрызм

Плянэрны гурток БДУ у недалёкім будучым зробіць вельмі добры і каштоўны падарунак ЦС Асоавіяхіму БССР. У сучасны момант **гурток канчае плянэр**, які пабудаваны выключна сіламі студэнтаў-сяброў гуртка. Гэты гурток зьяўляецца адным з актыўнейшых асоавіяхімаўскіх арганізацый унівэрсытэту. Больш-менш актыўныя сябры гуртка маглі-б быць скарыстаны, прайшоўшы некаторую праверку ў якасьці інструктароў плянэрных і мадэльных гурткоў. Тэарытычна яны досыць добра падрыхтаваны і маюць некаторую практыку ў будаўніцтве плянэру.

Можна сказаць некалькі слоў аб будучым нашага плянэру. Цэнтральны Савет Асоавіяхіму намячае адкрыць у Менску плянэрную станцыю, якая дасьць, наколькі будзе магчыма, нашай моладзі магчымасьць пазнаёміцца з самой тэхнікай палёту і што самае галоўнае, пры дапамозе гэтай станцыі можна будзе лепш адбіраць кандыдатаў у авіяшколы. Плянэр гуртка БДУ будзе першай авіямашынай менскай плянэрнай станцыі.

Справу плянэрызму ў нас на Беларусі трэба пашырыць, бо ў авіяцыйнай галіне ў нас няма амаль што ніякай работы. У нас у Менску, акрамя БДУ, няма ні аднаго плянэрнага і, здаецца, ні аднаго мадэльнага гуртка. А трэба, каб у кожнай школе быў мадэльны гурток, каб маладая сьвежая думка магла працаваць у карысным напрамку. Па мадэлізьме мы маем досыць багатую літаратуру, пры дапамозе якое можна шмат чаго зрабіць.

Справу мадэлізму і плянэрызму трэба ў БССР разьвіць і пашырыць.

А. М.

Павялічана норма хлеба рабочым

З 11-га студзеня норма хлеба рабочым павялічана на 100 грам. Замест 600 грам рабочыя атрымліваюць 700 грам.

Пашырэньне працкалектываў г. Менску

У гэтым годзе значна пашыраюцца менскія працкалектывы. Працкалектыў цацачнікаў «Адраджэньне» пашыраецца на 600 чалавек. У новы будынак працкалектыву гэтымі днямі пераносіцца 2 цэхі калектыву.

Працкалектыў швэйнікаў будзе пашыраны на 100 чал. Барысаўскі працкалектыў мэталістых павялічваецца на 60 чал. Пашыраецца таксама менскі працкалектыў паліграфвытворчасьці на 50 чалавек. Скончана пабудова мыечнага аддзяленьня працкалектыву «Утылізацыя», пабудаваны барак і сушылка. На працу ў аддзяленьне будзе прынята гэтымі днямі 150 чал., галоўным чынам, жанчын.

46 тыс. на перападрыхтоўку працаўнікоў асьветы

Калегія Наркамасьветы адпусьціла 46 тысяч рублёў на перападрыхтоўку ў 1930 годзе працаўнікоў асьветы. Будзе арганізавана 15 розных курсаў—для працаўнікоў дзіцячых садоў, яўрэйскіх і польскіх школ, інструктароў прафшкол, загадчыкаў хат-чытальнь і г. д.

Дзе будуць працаваць беларускія тэатры

Калегія Наркамасьветы зацьвердзіла плян работы Дзяржтэатру БССР на сэзон 1930-31 году. БДТ1 да 1 га сакавіка будзе працаваць у Віцебску, а да канца сэзона ў Менску, БДТ2 да 1-га сакавіка—у Менску, а потым у Магілеве. Яўрэйскі дзяржтэатр будзе працаваць у Гомелі і Бабруйску.

АЎТАМАБІЛІ ДЛЯ БССР

Гэтымі днямі Белдзяржгандль атрымае з Амэрыкі 10 аўтамашын сыстэмы «Форд». Машыны будуць скарыстаны, як таксі, 6 аўтамабіляў перададзеца для Менску і 4 для Гомелю.

Новыя ясьлі

З 1-га лютага на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» адкрываюцца ясьлі на 30 дзяцей. 20-га студзеня адкрываюцца ясьлі на 50 дзяцей сямейных студэнтаў камбузу.

ДЭЛЕГАЦЫЯ РАБКОРАЎ - ЧЫГУНАЧНІКАЎ У т. РЫЖОВА

Учора дэлегацыя ўсебеларускай нарады рабкораў - чыгуначнікаў наведала старшыню ЦСПСБ т. **Рыжова**. Тав. Рыжоў даў адказ на рад запытаньняў дэлегатаў аб новых мэтадах і формах прафсаюзнай работы, аб задачах прафсаюзаў у сувязі з чысткай савецкага апарату. і г. д.

Пабудова аўтаматычнай тэлефоннай станцыі

Член калегіі НКПіТ т. **Валенбэрг** паведаміў прэзыдыуму Менгарсавету аб тым, што **будаўніцтва аўтаматычнай тэлефоннай станцыі** у Менску **пачнецца ў бягучым годзе**. У сувязі з разьвіцьцём народнай гаспадаркі, ёмістасьць станцыі павялічыцца да 5.000 нумароў. Праект станцыі будзе гатоў 15 лютага.

СУД

Да справы аб самагубстве рабкора Багайскага

Вызначаны склад выязной сэсіі Вярхоўнага суду ў г. Ніжове, яка будзе 15-га студзеня разглядаць справу аб вінавайках самагубства рэдактара насьцянгазэты папяровай фабрыкі «Спартак» тав. Багайскага.

Старшынёй суду будзе намесьнік старшыні Вярхоўнага суду тав. **Гінзбург**, нарасядацелямі—т. т. Кацман і Шкляраўскі. Дзяржаўны абвінаваўца—пракурор Вярхоўнага суду тав. **Міхайлаў**; грамадзкія абвінаваўцы ад ЦСПСБ—тав. **Табайнік** і ад рэдакцыі газэты «Камунар Магілеўшчыны»—тав. **Пераход**.

Абаранць падсудных будуць члены магілеўскай калегіі абаронцаў.

Растраты ў вясковай каапэрацыі

Рэвізія спажывецкага таварыства ў вёсцы Юрава, Смалявіцкага раёну, выявіла, што з-за сыстэматычнай пакражы грошай і тавараў крама каапэрацыі была даведзена да поўнага развалу. Пакрадзена грошай і тавараў на 3.000 рублёў, разбазарана 400 пудоў жыта.

Устаноўлена, што растраты і пакражы зрабіў загадчык крамы **Арашэвіч**. Выязная сэсія Менскага акруговага суду ў Смалявічах прыгаварыла Арашэвіча да 8 год пазбаўленьня волі з суровай ізаляцыяй. Старшыня праўленьня Юравіцкай каапэрацыі **Гатаўчын**, які сыстэматычна п'янстваваў і растрачваў вялікія сумы грошай, прыгавораны таксама да 8 год з суровай ізаляцыяй.

Пэрыядычныя прыбаўкі мэдычнаму пэрсаналу

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР аб пэрыядычных прыбаўках мэдычнаму пэрсаналу санітарна-гігіенічных установаў. Згодна гэтай пастановы, права на атрыманьне пэрыядычнай прыбаўкі маюць тыя мэдычныя працаўнікі, якія працавалі ў псыхіятрычных установах да 1-га кастрычніка 1930 г. ня менш 3-х год. Пэрыядычныя прыбаўкі ўстанаўліваюцца ў разьмэры 20 проц. да асноўнай зарплаты.

Дапамога пацярпаўшым ад кулацкага тэрору

Сакратарыят ЦВК БССР зацьвердзіў пастанову аб дапамозе асобам і гаспадаркам, якія пацярпелі ад кулацкага тэрору. Для гэтай мэты пры акрвыканкомах утвараюцца спэцыяльныя фонды. Пытаньне аб выдачы дапамогі і разьмерах яе будзе вырашацца спэцыяльнымі камісіямі, якія арганізуюцца пры акрвыканкомах.

Беларускі палітэхнічны інстытут

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР унёс на зацьвярджэньне ў СНК праект струк туры першай на Беларусі ВНТУ, якая адкрываецца ў Менску ў новым навучальным годзе.

Палітэхнічны інстытут будзе складацца з чатырох факультэтаў: хэміка-тэхналёгічнага з аддзяленьнямі песахэмічным, папяровым, тарфяным, харчовым, керамічна - шкляным; мэханічнага факультэту з аддзяленьнямі электра - тэхнічным, цёпла-тэхнічным, машына - будаўнічым, леса-мэханічным; будаўнічага факультэту з аддзяленьнямі фабрычна - заводзкага, камунальнага, жыльлёвага, дарожнага будаўніцтва і прамыслова - эканамічнага факультэту. Кантынгэнт студэнтаў палітэхнікуму ўстаноўлен у 1.400 чалавек з прыёмам у 465 чалавек. Курс навучаньня на факультэтах хэміка - тэхналёгічным, мэханічным і будаўнічым устаноўлен у 4 гады, а на прамыслова-эканамічным—у 3 гады.

Масавая экскурсія студэнтаў у Маскву, Ленінград і Харкаў

У сувязі з зімовымі каніхуламі, студэнцкія арганізацыі Беларусі наладжваюць масавыя экскурсіі у Маскву, Ленінград і Харкаў. У экскурсіях прыме ўдзел 1.160 студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў. Экскурсанты наведаюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы і культурныя ўстановы пралетарскіх цэнтраў.

«НЯМА З КАГО І ШТО ВАРАЦЬ»

Пад такім загалоўкам была зьмешчана заметка ў «Зьвязьдзе» № 248 аб тым, што гр-ка Алісевіч на працягу каля 2-х год не магла спагнаць алімэнтаў з Хаго-ня-Ніко-Ніко-Ніко